25 ЛЮТАГА 2024 ГОДА **ВЫБІРАЕМ БУДУЧЫНЮ РАЗАМ!** АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ



ЯК ЖЫВЕ СЯМ'Я КУРСАНТАЎ

5

БАІ ІШЛІ ПАД РАГАЧОВАМ

8–9




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

24 ЛЮТАГА 2024 г. СУБОТА № 39 (30173)


# СВАЮ ГІСТОРЫЮ ПІШАМ САМІ

**Заўтра — адзіны дзень галасавання. Упершыню ў гісторыі сучаснай Беларусі ён праводзіцца ў такім фармаце. І ў назве гэтага дня, і ў яго слогане «Будучыню выбіраем разам» закладзеныя надзвычай важныя для кожнага з нас і для краіны ў цэлым сэнсы. Адзіны дзень галасавання значыць не толькі тое, што выбіраем адразу дэпутатаў усіх узроўняў, але і тое, што робім гэта, дэманструючы ўсяму свету сваё адзінства, сваё жаданне і ўменне самім вызначаць, па якім шляху ісці. «Выбіраем разам» — не толькі таму, што выбіраем УСІХ дэпутатаў, але і выбіраем іх УСЕ. Здаецца, менавіта гэта ў класічным, не сапсаваным, не перайначаным варыянце і называецца сапраўднай дэмакратыяй — уладай народа.**

**Гэты дзень увойдзе ў гісторыю нашай незалежнай краіны. Як і кожны з нас, хто прыйдзе на выбарчы ўчастак і аддасць свой голас за свайго кандыдата. Яшчэ раз пацвердзіўшы тым самым, што сваю дарогу, па якой ісці нам, нашым дзецям і ўнукам, мы, без падказак і патуранняў, выбіраем самі.**



Фота БелТА.

З першых вуснаў

# «ВЫ РОБІЦЕ ЎСЁ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАХАВАЦЬ КРАІНУ, МІРНАЕ НЕБА НАД ЁЙ»



Фота БелТА.

**У свята абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з галоўнымі героямі гэтага дня. Галоўнакамандуючы ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і пагоны вышэйшаму афіцэрскаму саставу.**

«Мы ўсе тут прысутныя, людзі свае, таму буду з вамі абсалютна шчырым. Вы робіце ўсё для таго, каб захаваць краіну, чыстае неба над ёй. Сёння 23 лютага мы ўзнагароджваем сапраўдных абаронцаў Айчыны. За баявыя заслугі ў мірны час. І мірным для нас ён застаецца таму, што нашы воіны стаяць на шляху рэальнага ворага як перашкода. Стаяць непераадольнай сцяной, своечасова выяўляючы і затрымліваючы дыверсантаў, праводзячы размініраванне выбуховых прыстасаванняў. У нас спакой і цішыня, таму што нашы хлопцы ўкараняюцца ў тэрарыстычныя групы з рызыкай для свайго жыцця, перакрываюць каналы паставак у краіну смяротнай зброі і боепрыпасаў, спыняючы шпіёнскую дзейнасць замежных спецслужбаў», — сказаў Прэзідэнт.

СТАР. 2

КОРАТКА

- **У Беларусі ўведзеныя дадатковыя ўмовы для датэрмінаванага выкарыстання сямейнага капіталу.**
- Брэсцкая крэпасць можа папоўніць Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.
- **Новы праект для навучэнцаў «Урок у музеі» стартаваў у Мінску.**

ISSN 1990 — 763X

24039

Пазнай Беларусь

# АБУДЗІЦЬ ІНТАРЭС ДА ПРАВІНЦЫІ

## Турыстычная галіна Гродзенскай вобласці скіравана на развіццё рэгіёнаў

**Горад Гродна даўно набыў славу турыстычнай меккі Беларусі. Па сутнасці, гэта музей пад адкрытым небам, які выклікае інтарэс кожнага вандроўніка. Сапраўды, у сезон турыстычныя групы можна сустрэць літаральна на кожным кроку гістарычнага цэнтра. Цяпер варта ісці далей і прыцягваць падарожнікаў у іншыя куткі Гродзеншчыны, лічаць у абласным турыстычным ведамстве.**

Патэнцыял раёнаў апошнім часам значна вырас. Тут удала папулярызуюць сваю адметнасць, брэндавыя падзеі і знакамітыя культурна-гістарычныя аб'екты. Расце інтарэс да экалагічных маршрутаў, сафары-тураў і водных сплаваў.

### Адкрыццё для расіян

Увогуле турызм у Гродзенскай вобласці б'е рэкорды. Летась упершыню з турыстычнымі мэтамі тут пабывалі 1,2 мільёна чалавек, палова з іх — з начлегам. У параўнанні з папярэднім годам тэмп росту склаў 150 %. Амаль на 40 % павялічылася колькасць замежнікаў, іх пабывала каля 80 тысяч чалавек. Гэта ў большасці грамадзяне Расійскай Федэрацыі — каля 85 %.

СТАР. 13



# «ВЫ РОБІЦЕ ЎСЁ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАХАВАЦЬ КРАІНУ, МІРНАЕ НЕБА НАД ЁЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што наш народ спіць спакойна таму, што ў баявых аперацыях, часам з рызыкай для жыцця, удзельнічаюць і афіцэры, і генералы. Найлепшыя з іх удастоены высокіх дзяржаўных узнагарод і вышэйшых воінскіх званняў. «Дзякуй, паважаныя сябры, за службу! За тое, што гібрыдныя атакі на Беларусь не перараслі ў поўнамаштабную гарачую бойню. Дзякуй усім, хто плячом да пляча стаіць побач з вамі, аберагаючы мір і спакой на роднай зямлі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Звяртаюся да кожнага, хто абраў высакародную прафесію — Радзіму абараняць. Да ўсіх, хто ўжо зараз марыць калі-небудзь апрануць ваенны мундзір і з гонарам служыць сваёй краіне, свайму народу. На нашы плечы ўскладзена найвышэйшая адказнасць за будучыню Беларусі. І гаворка не толькі пра гатоўнасць устаць на яе абарону са зброяй у руках, не дапусціць уцягвання краіны ў канфлікт».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, сёння як ніколі важны ўдзел ваенных і ў выхаванні падрастаючага пакалення. «Вы жывы прыклад гэтаму пакаленню, — адзначыў ён. — Хто, калі не вы, павінен стаць прыкладам выключнай адданасці Айчыне? Хто, калі не вы, можа быць прыкладам мужнасці і доблесці? Прыкладам, які выхоўвае без слоў».

Прэзідэнт заўважыў, што як бы ні развіваліся сучасны тэхналагічны кірунак і сучасныя тэхналогіі, як бы ні ўдасканальваліся сродкі вядзення бою, без стойкасці і моцы духу воіна няма і не можа быць перамог. «Зноў, як заўсёды ў цэнтры ўвагі — чалавек», — заўважыў ён.

«Паважаныя сябры, усіх вас і тых, хто нас сёння пачуе, віншую з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл! Дзякую за ратную працу, мужнасць і самаахвярнасць. Шчасця вам, вашым родным і блізкім, здароўя і поспехаў у службе на карысць нашай Радзімы», — пажадаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што сёння віншуюць усіх, хто носіць пагоны. Гэта азначае, што гэта не толькі мужчынскае свята. «Яно ўжо стала ўсенародным — мужчынскім, жаночым святам, бо вельмі шмат нашых добрых доблесных жанчын носяць сёння пагоны ваеннаслужачых. Таму яшчэ раз з гэтым усенародным светлым святам хачу вас павіншаваць», — сказаў ён.

**❍ У тэму**

## Усе задачы будуць выкананы

У размове з журналістамі героі дня крыху расказалі пра сваю няпростую, але вельмі важную службу. Палкоўніку Уладзіміру Беламу было прысвоена чарговае воінскае званне генерал-маёра. «Кіраўнік дзяржавы паставіў перад намі вельмі дакладныя і зразумелыя задачы. Усе задачы рэальныя, і мы гатовы выканаць іх без выключэння», — запэўніў ён. Уладзімір Белы — камандуючы войскамі Заходняга аператыўнага камандавання. Ён падкрэсліў, што яго калектыў адчувае ўсю складанасць абстаноўкі на заходняй граніцы. Але, як запэўніў генерал-маёр, усе часці баяздольныя, гатовыя выканаць пастаўленыя задачы. «Гэта добра ведае кожны, хто знаходзіцца па тым боку граніцы. Нашы вайскоўцы, калі выбіралі сваю прафесію, ні разу не памыліліся ў гэтым. Калі выбіраеш справу вайскоўца, ты павінен быць гатовы ахвяраваць сваім жыццём у абарону сваёй Айчыны. Таму задачы будуць выкананы, і, я ўпэўнены, мір будзе захаваны», — сказаў ён.

Званне генерал-маёра прысвоена і палкоўніку Валерыю Равенку, які ўзначальвае Дэпартамент міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва. На чарговае званне ён адрэагаваў класічным выразам: «Які салдат не марыць стаць генералам?» Па яго словах, прысваенне звання — гэта паказчык эфектыўнасці работы. «Калі кіраўнік дзяржавы адзначае чарговым воінскім званнем, значыць, работа выканана добра. Мы заўсёды памятаем словы Прэзідэнта аб тым, што калі кожны чалавек будзе займацца сваімі справамі на сваім месцы, выконваць свае задачы, то і праблем не будзе», — сказаў Валерый Равенка. Ён расказаў, што сама сутнасць дэпартамента, які ён узначальвае — міжнароднае супрацоўніцтва, адстойванне інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, пошук партнёраў і саюзнікаў, чым мы сёння і займаемся. Гэта таксама і пошук кампрамісаў з заходнімі дзяржавамі, пошук кантактаў з прадстаўнікамі заходніх дзяржаў для таго, каб зменшыць напружанасць вакол нашай дзяржавы. «Гэта вельмі сур'ёзная работа, і расслабляцца ні ў якім разе нельга. Я не скажу, што сюрпрызы з іх боку ёсць — мы ўсё гэта прадугледжваем, прадбачым і спрабуем зрабіць наш рэгіён больш бяспечным. Будучыня пакажа, як гэта атрымаецца. На сёння, мяркуючы па тым, што кіраўнік дзяржавы адзначыў шмат афіцэраў дзяржаўнымі ўзнагародамі, воінскімі званнямі, можна сказаць, што мы рухаемся ў патрэбным кірунку», — падсумаваў генерал-маёр.

Таксама званне генерал-маёра прысвоена Сяргею Лагадзюку. Пагоны генерал-маёра міліцыі Прэзідэнт уручыў Андрэю Паршыну. Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў палкоўнікаў юстыцыі Сяргея Гамко і Аляксандра Сяменіка, генерал-маёра Аляксандра Невяроўскага і палкоўніка Віталя Федзючка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Блізкая ўлада

# АДЗІН ЗВАНОК — КАНКРЭТНАЕ РАШЭННЕ

### Наталля КАЧАНАВА правяла прамую тэлефонную лінію

**Такі фармат зносін з членамі Савета Рэспублікі заўсёды карыстаецца папулярнасцю ў насельніцтва. Аб гэтым сведчыць і той факт, што тэлефон у кабінеце спікера верхняй палаты парламента не змаўкаў ні на хвіліну. Свае просьбы і прапановы агучылі жыхары практычна ўсіх рэгіёнаў краіны. Традыцыйна грамадзян хвалююць зямельныя і жыллёвыя пытанні, заканадаўчае рэгуляванне канкрэтных момантаў, працаўладкаванне, добраўпарадкаванне тэрыторый. Не абышлося і без пытанняў, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі сістэмы аховы здароўя.**




Адразу два чалавекі, якія датэлефанаваліся на прамую лінію, паскардзіліся на невыкананне абавязкаў сталічнай кампаніяй-забудоўшчыкам. Сем'і агучылі праблему, якая, мяркуючы па ўсім, датычыцца вялікай колькасці навасёлаў кватэр у жыллёвым комплексе «Мінск-Свет». І адна, і другая сем'і атрымалі ключы ад сваіх кватэр яшчэ ў верасні, але дагэтуль ім не выдаюць дакументы, якія ўстанаўліваюць правы на набытую ўласнасць. Атрымліваецца, што гаспадары кватэр у новабудоўлі не могуць там ні рамонт рабіць, ні нават прапісацца. У сувязі з апошнім вымушаны плаціць немалыя грошы за камунальныя паслугі, хоць самі там яшчэ і не жывуць.

Наталля Качанава расказала, што падчас апошняга прыёму грамадзян, які яна праводзіла ў Савеце Рэспублікі, на ім прысутнічала гендырэктар кампаніі «Дана Астра», якая з'яўляецца забудоўшчыкам дадзенага жыллёвага комплексу. «Мяне клятвенна заверылі, што ўсе гэтыя пытанні будуць вырашаны, — звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы разбяромся, асабіста зоймемся гэтымі пытаннямі».

Яна адзначыла, што адпаведныя даручэнні будуць дадзены старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміру Кухараву. Спікер заўважыла, што пасля выхадных з грамадзянамі, якія агучылі ёй сваю праблему, звяжацца кіраўнік сакратарыята Савета Рэспублікі, каб даведацца, ці вырашана іх праблема.

Алена Віктараўна з Баранавіч паскардзілася на нежаданне мясцовых улад добраўпарадкоўваць вуліцу на тэрыторыі прыватнага сектара. Справа ў тым, што вуліца Анісімавіцкая, нягледзячы на тое, што знаходзіцца ў межах горада, не мае цвёрдага пакрыцця, а таму ў дажджлівае надвор'еператвараецца ў балота. «Шмат жыве дзяцей, якія наведваюць школу, дзіцячы садок, а дарогі няма — гравійка і бруд, — канстатавала жанчына. — Ні праехаць, ні прайсці. Нават хуткая дапамога, калі патрэбна, да нас дабрацца не можа. Да таго дайшло, што горы смецця стаяць — смеццявоз не заўсёды можа пад'ехаць».

— А што кажа гарадская ўлада? — пацікавілася Наталля Іванаўна.

Заяўніца расказала, што неаднаразова жыхары вуліцы звярталіся ў гарадскі выканаўчы камітэт, на што атрымлівалі адказ — у гарадскім бюджэце няма сродкаў. А калі і ёсць, то яны, са слоў жанчыны, накіраваны на добраўпарадкаванне іншых вуліц.

— Паспрабуем вам дапамагчы, — паведаміла спікер верхняй палаты парламента і адразу дала даручэнне праінфармаваць аб сітуацыі старшыню Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта Юрыя Шулейку з мэтай узяць зварот на кантроль.

Мінчанін Сяргей Віктаравіч звярнуўся з пытаннем электрыфікацыі, якое датычыцца як яго асабіста, так і ўвогуле жыхароў пасёлкаў, што знаходзяцца побач з Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогай. Мужчына расказаў, што на аўкцыёне набыў два зямельныя ўчасткі — у Сеніцы і Калядзічах. Падвёў электрычнасць, але з вельмі нізкай магутнасцю. Куды толькі не звяртаўся, каб палепшыць сітуацыю, але выйсця пакуль няма.

— Куды вы звярталіся? — удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі.

— У «Мінскія электрасеткі».

— Пабудавалі на ўчастках што-небудзь?

— Так, але не магу там нічога рабіць.

Наталля Качанава адказала, што ў сітуацыі разбяруцца — адпаведнае даручэнне будзе дадзена Міністэрству энергетыкі. «Мы праінфарміруем вас адразу, — дадала яна. — Гэта не толькі вас датычыцца, але і развіцця пасёлкаў».

Канкрэтныя парады і рэкамендацыі, даручэнні кампетэнтным службовым асобам і ведамствам — менавіта так Савет Рэспублікі працуе са зваротамі грамадзян. Толькі за 2023 год членамі верхняй палаты парламента, у тым ліку асабіста спікерам, было разгледжана 7,5 тысячы зваротаў. У мінулым годзе адбылося больш як дзве тысячы сустрэч з працоўнымі калектывамі, насельніцтвам па месцы жыхарства, праведзена звыш 700 асабістых прыёмаў грамадзян, больш за 300 прамых тэлефонных ліній. І гэтая работа працягваецца.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

*З якімі яшчэ пытаннямі грамадзяне тэлефанавалі да Наталлі Качанавай, чытайце ў найбліжэйшым выпуску «Мясцовага самакіравання».*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Амерыканскі модуль упершыню за больш як паўстагоддзя высадзіўся на Месяцы



Беспілотны пасадачны модуль амерыканскай кампаніі Intuition Machine, які атрымаў назву Odysseus, высадзіўся ў раёне паўднёвага полюса спадарожніка Зямлі, паведаміла NASA. Місія пад кодавай назвай IM-1 азначае сабой першы палёт робата кампаніі Intuition Machine на паверхню Месяца. Навуковыя мэты місіі ўключаюць вывучэнне ўзаемадзеяння шлейфа з паверхняй, радыёастраномію і ўзаемадзеянне касмічнага надвор'я з месяцавай паверхняй. Паводле даных NASA, будуць таксама прадэманстраваны тэхналогіі дакладнай пасадкі і магчымасці вузлоў сувязі і навігацыі. Апошняя адпаведная місія ЗША была ажыццёўлена ў снежні 1972 года, калі «Апалон-17» высадзіўся на месяцавай паверхні для выканання заключнай місіі праграмы «Апалон». На сённяшні дзень на Месяц прызямляліся касмічныя караблі ўсяго пяці краін: ЗША, СССР, Кітая, Індыі і зусім нядаўна Японіі.

## Ва ўсходняй частцы Інданезіі адкрыты найбуйнейшы порт



Інданезія інвеставала 5,4 трыльёна інданезійскіх рупій (каля 345 мільёнаў долараў) у будаўніцтва новага порта Макасар у Паўднёвым Сулавесі, другога па велічыні ў краіне пасля Танджунга ў Джакарце, паведаміла «Сіньхуа». «Мы спадзяёмся, што гэты буйны порт, размешчаны на ўсходзе Інданезіі, зможа знізіць унутраныя лагістычныя выдаткі», — заявіў прэзідэнт Інданезіі Джока Відода падчас цырымоніі адкрыцця. З-за адсутнасці інтэграцыі паміж размяшчэннем партоў і заводаў ды прамысловых зон выдаткі на лагістыку ў Інданезіі дзесяць гадоў таму дасягнулі 24 працэнты. Па словах Джока Відода, хоць цяпер гэты паказчык знізіўся да 14 працэнтаў, яшчэ шмат чаго трэба зрабіць для далейшага зніжэння гэтага паказчыка. Новы порт Макасар мае глыбіню 16 метраў і ёмістасць да 2,5 мільёна TEU, што дазваляе размяшчаць буйныя судны, якія перавозяць кантэйнеры.

## Кіраўніку японскай мафіі ў ЗША прад'яўлена абвінавачанне ў незаконным абароце ўрану і плутонію



Амерыканскія ўлады лічаць, што злачынец, які ўтрымліваецца ў бруклінскай турме, з'яўляецца высокапастаўленай асобай японскага сіндыката арганізаванай злачыннасці, вядомага як якудза, які ажыццяўляе аперацыі ў Шры-Ланцы, М'янме, Тайландзе і ЗША, паведаміла «Бі-бі-сі». Міністэрства юстыцыі ЗША заявіла, што абвінавачаны і яго саўдзельнікі паказалі ўзоры ядзерных матэрыялаў у Тайландзе супрацоўніку пад прыкрыццём Агенцтва па барацьбе з наркотыкамі (DEA). Пракуроры таксама сцвярджаюць, што ён імкнуўся набыць вялікую колькасць зброі ваеннага прызначэння ад імя неўстаноўленай паўстанцкай групоўкі ў М'янме. Узбраенне ўключала ракеты класа «зямля-паветра», штурмавыя і снайперскія вінтоўкі, кулямёты, ракеты рознага калібру і разнастайны тактычны рыштунак.

На свае вочы

# «ТУТ МЫ АДЧУВАЕМ МОЦ НАШАГА НАРОДА»

## У Палацы Незалежнасці зноў госці

**У Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл падарунак атрымалі і супрацоўнікі ААТ «Інтэграл» і ААТ «АГАТ-сістэмы». Падарунак для іх стаў асаблівы. ААТ «Інтэграл» у снежні 2023 года адзначыла 60-годдзе з дня заснавання. Распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 02.02.2024 адкрытаму прадпрыемству за значны ўклад у развіццё мікраэлектронікі, умацаванне прамысловага патэнцыялу краіны аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. ААТ «АГАТ-сістэмы» 26 лютага адзначыць 55-годдзе.**





Для супрацоўнікаў прадпрыемстваў гэта самы незвычайны падарунак у жыцці — экскурсія ў Палац Незалежнасці. Для самога палаца мерапрыемства традыцыйнае, а для яе гасцей — незабыўнае. Стартавала экскурсія ў бадай ці не самым знакамітым памяшканні краіны — зале ўрачыстых цырымоній. Яна сустракала самых моцных палітыкаў, знакамітых спартсменаў і артыстаў, найлепшых людзей краіны. Таму госці захапляюцца не толькі дзівосным убраннем, але і атмасферай, якая тут пануе. Пышныя люстры, эксклюзіўная мэбля, карціны, мазаіка з паркету і мноства выдатных дэталяў ствараюць асаблівую атмасферу ў кожнай зале. Эмоцый дадае і тое, што амаль усё ў Палацы Незалежнасці створана беларусамі з беларускага.

«Тут прымаюцца лёсавызначальныя рашэнні і на міжнародным узроўні, і ва ўнутранай палітыцы. Тут працуюць самыя лепшыя людзі і розумы. Грандыёзны будынак. Асабліва ўразіла, што гэта ўсё зроблена рукамі нашых спецыялістаў у найкарацейшыя тэрміны. Такі вялізны будынак! Дачу пабудаваць — і то займае шмат гадоў. А гэта сімвал Беларусі, рэспублікі, яе аблічча. Сюды з'язджаюцца дэлегацыі з усяго свету. Яны ў захапленні. Мы можам толькі ганарыцца такім будынкам, які сімвалізуе нашу незалежнасць», — падзяліўся ўражаннямі **начальнік аддзела ААТ «АГАТ-сістэмы кіравання» — кіруючая кампанія холдынга «Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання» Вадзім РАМАНАЎ.**

Усяго ў палацы 20 асноўных залаў, дзе праходзяць найважнейшыя мерапрыемствы. І іх атмасфера таксама ўражвае гасцей. Сапраўды, калі яшчэ давядзецца пабываць у залах, дзе прымаюцца найважнейшыя для жыцця краіны рашэнні, убачыць на свае вочы, у якой абстаноўцы працуе Прэзідэнт. Нязменна вылучаецца зялёная зала, якая ў 2015 годзе прыняла перагаворы нармандскай чацвёркі. Зрабіць фота ў інтэр'ерах, якія ведае ўвесь свет, — абавязковы пункт для гасцей палаца. Таксама лічыцца, што калі ў сценах Палаца Незалежнасці загадаць жаданне, а лепей — паставіць мэту, то ўсё абавязкова здзейсніцца. Калі, зразумела, не забываць плённа працаваць.





«У першую чаргу хацелася б выказаць вялікую падзяку за прадастаўленне нам такога гонару — наведаць Палац Незалежнасці. З першых хвілін тут мы адчуваем моц і веліч беларускага народа. Тут мы бачым праяву таленту нашых людзей. Уражвае маштаб, бо столі 18 метраў убачыш не кожны дзень. Запрашэнне ў Палац Незалежнасці моцна матывуе эфектыўна працаваць і развівацца на сваім прадпрыемстве ў прыватнасці і ў цэлым у краіне», — адзначыў **Артур ГАРАНІН, інжынер-электронік ААТ «Інтэграл».**

Захопленыя погляды наведвальнікаў гавораць аб тым, што Палац Незалежнасці іх уразіў. І нядзіўна, бо гэта сімвал беларускай дзяржаўнасці, дзе госці ў тым ліку адчулі дачыненне да гістарычных падзей, якія тут праходзілі. У інтэр'ерах Палаца Незалежнасці кожны госць знайшоў самае адметнае для сябе — цікавыя рэчы, дэкор і, канешне, шматлікія гісторыі. Па словах экскурсантаў, рэальнасць пераўзышла ўсе чаканні. І няхай кожны вынес з гэтай экскурсіі нешта сваё, у адной думцы сышліся ўсе: Палац Незалежнасці трэба наведаць кожнаму. І самае прыемнае, што гэта абсалютна рэальна. Бо галоўны будынак краіны створаны беларусамі для беларусаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**




### О реализации имущества ООО «МАКСИСТРОЙДИЗАЙН»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Ликвидатор ООО «Резервы управления» директор Пшеничный Александр Владимирович, тел. 80293663113 |
| **Продавец** | ООО «МАКСИСТРОЙДИЗАЙН», УНП190460235, г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 142, пом. 9 |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Первые торги в форме открытого аукциона **27.03.2024 в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 50, корп. 5, каб. 305 |
| **Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним** | **Лот № 1:** **Автомобиль легковой CITROEN JUMPY-Veras 307605,** VIN № Y39307605K0103102, Z8TVB9HFAKM031683, б/у, 2019 г. в., тип кузова: вагон. **Автомобиль легковой Mercedes-Benz C 180,** VIN № WDD2053401F793760, б/у, 2018 г. в., тип кузова: купе. **Автомобиль легковой Mercedes-Benz GLE 400 d,** VIN № WDC1671231A063616, б/у, 2019 г. в., тип кузова: внедорожник универсал. **Автомобиль легковой Volvo XC90,** VIN № YV1LC08ACK1508272, б/у, 2019 г. в., тип кузова: внедорожник универсал. **Стоимость лота составляет – 311 200,00 рублей. Без НДС.** Подробно ознакомиться с информацией и перечнем можно с пн. по пт. с 09.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 50, корп. 5, каб. 305, предварительно связавшись с представителями ликвидатора |
| **Порядок проведения торгов** | Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Победителем признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Договор купли-продажи заключается в течение пяти дней с даты проведения аукциона |
| **Размер, порядок и сроки внесения задатка** | 10 % от начальной цены лота до подачи заявления перечисляется на р/с BY58ZEPT30120013540189330000 в ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК» г. Минск, код ZEPTBY2X, УНП 190460235 |
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявление на участие в аукционе, платежный документ с отметкой банка о внесении задатка, копии документов, подтверждающих юридические полномочия участника торгов, представляются **не позднее 17.00 26.03.2024** по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 50, корп. 5, каб. 305. Сроком поступления заявления является дата регистрации в журнале регистрации |

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

**1) Здание нежилое, инженерные сети,**
**объекты благоустройства, по ул. Матросова, 3 в г. п. Россь Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**2) Здание казармы под склад с террасой,**
**инженерные сети, объекты благоустройства, по ул. Красноармейской, 47 в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 4 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

Аукцион состоится – **21.03.2024 г. в 11.30.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **15.03.2024 г. до 16.00.**

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске **8 (01512) 5 13 44, 2 06 03.**
в городе Гродно **8 (0152) 62 39 24, 62 39 32, 62 39 23.**
Дополнительная информация размещена на сайте:
**https://au.nca.by**

УНП 500042135

### Извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Банк БелВЭБ»

Аукцион состоится **05.03.2024, начало – 10.00, окончание – 16.00** на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by.
Время приема заявок: **с 24.02.2024 09.00 до 04.03.2024 г. 17.00**

**Организатор аукциона:** ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

**Продавец:**
ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

**Лот № 1: капитальное строение с инв. № 330/С-33528, расположенное по адресу: г. Мозырь, ул. Саета Г.Е., 4. Общая площадь: 738,7 кв. м. Наименование: здание банка. Назначение: здание специализированное финансового назначения.** Начальная цена с учетом НДС 20 % – 980 949,52 бел. руб. Размер задатка – 10 % от начальной цены лота. Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота. Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by. Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – ООО «Индустрия Инноваций»

**Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

### ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОДО «ФАРМИН»** (УНП 190073936), объявляет о проведении **27.03.2024 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

Утерянный договор страхования серии ВЗР 0022295 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**

# ГАРАНТ СУВЕРЭНІТЭТУ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

**У Палацы Рэспублікі адбыўся ўрачысты сход з нагоды Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь**

**Як падкрэсліў падчас свайго выступлення дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, ваенная арганізацыя краіны сёння з'яўляецца надзейнай апорай беларускай дзяржаўнасці, школай мужнасці і патрыятызму. «Перш за ўсё, маладых людзей, тых юнакоў і дзяўчат, якія выбралі самую важную і патрэбную прафесію — Радзіму абараняць», — адзначыў ён і звярнуў увагу на тое, што за перыяд незалежнасці ў Беларусі створаны кампактныя, высокамабільныя структуры, якія ўваходзяць у сістэму забеспячэння нацыянальнай бяспекі і з'яўляюцца гарантам суверэнітэту і незалежнасці.**



Па словах дзяржсакратара, ядром ваеннай арганізацыі дзяржавы з'яўляюцца Узброеныя Сілы. «Сёння беларуская армія мае на ўзбраенні самыя сучасныя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі, — дадаў Аляксандр Вальфовіч. — А галоўнае, у ёй служаць прафесіяналы і патрыёты нашай краіны, здольныя абараніць наш народ ад сучасных выклікаў і пагроз, супрацьстаяць сучасным гібрыдным войнам».

**Міністр абароны Віктар ХРЭНІН** нагадаў, што, прайшоўшы праз горан сусветных войнаў і выстаяўшы ў іх, беларускі народ на генетычным узроўні набыў непрыманне любой узброенай агрэсіі. «Памятаючы тыя пакуты, на якія выраклі беларускі народ нямецка-фашысцкія захопнікі і іх памагатыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, мы, спадчыннікі пераможцаў, не дапусцім таго, каб на беларускую зямлю іззноў ступіла нага акупанта, — акцэнтаваў увагу кіраўнік абароннага ведамства. — Беларуская армія поўная рашучасці абараніць беларускі народ усёй сваёй сілай, у аснове якой не толькі сіла зброі, а перш за ўсё — сіла духу, згуртаванасць шэрагаў, адданасць Айчыне і абавязку. Гісторыя памятае — беларусы ўмеюць абараняць сваю зямлю. Мы заўсёды былі і заўсёды будзем мацнейшымі за любыя выклікі!»

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота БелТА.**

Акцэнты

# «БЕЛАРУСЬ — МІРАЛЮБІВАЯ ДЗЯРЖАВА, ЯКАЯ ПАВАЖАЕ ПАЛІТЫЧНУЮ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І ДЗЯРЖАЎНЫ СУВЕРЭНІТЭТ ІНШЫХ КРАІН»

**Асноўныя пасылы брыфінгу начальніка Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочніка міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва**

**У прысутнасці прадстаўнікоў ваенна-дыпламатычнага корпуса, акрэдытаваных пры абаронным ведамстве нашай краіны, Валерый РАВЕНКА расказаў аб ключавых момантах, якія ляглі ў аснову новай Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь, даў актуальную інфармацыю аб кірунках будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл, расказаў аб асаблівасцях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва. На брыфінгу прысутнічалі прадстаўнікі 28 дзяржаў, сем з якіх з'яўляюцца членамі НАТА.**

## Мілітарысцкія настроі нашых суседзяў

Валерый Равенка звярнуў увагу на працэсы, якія павышаюць верагоднасць узнікнення ваенных канфліктаў каля граніц Беларусі, і ўключэнне ў іх нашай дзяржавы. У прыватнасці, гэта мілітарызацыя еўрапейскага кантынента, пашырэнне кантролю з боку ЗША над палітычнымі працэсамі ў Еўропе праз звязванне еўрапейскіх дзяржаў сяброўствам ці рознымі формамі партнёрства з НАТА. Акрамя таго, спыняецца ўзаемадзеянне дзяржаў — членаў НАТА з Беларуссю ў ваеннай сферы.

«Сведчаннем далейшай мілітарызацыі Еўропы з'яўляецца падтрыманне высокага ўзроўню ваеннай прысутнасці ЗША ў рэгіёне і канцэнтрацыя кааліцыйных войскаў (сіл) на ўсходнім флангу НАТА, у тым ліку ў непасрэднай блізкасці ад граніц Беларусі, — адзначыў ён. — Для любога ваеннага спецыяліста перыядычнасць і змена ўзроўню высокіх службовых асоб НАТА і дзяржаў, якія ў яго ўваходзяць, азначаюць не што іншае, як актыўную падрыхтоўку Узброеных Сіл, у тым ліку на нашай тэрыторыі».

Начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва ўдакладніў, што размешчаныя ва ўсходнееўрапейскіх дзяржавах воінскія фарміраванні блока актыўна прыцягваюцца да ўдзелу ў мерапрыемствах аператыўнай і баявой падрыхтоўкі. Пры гэтым захоўваецца высокая інтэнсіўнасць вучэнняў, якія праводзяцца, з адначасовым ростам колькасці сіл і сродкаў, што прыцягваюцца, у тым ліку на тэрыторыі дзяржаў, якія мяжуюць з Беларуссю.

«У лютым — маі ў еўрапейскім рэгіёне пройдзе серыя вучэнняў аб'яднаных узброеных сіл НАТА і ўзброеных сіл ЗША «Абаронца-2024», — паведаміў Валерый Равенка. — У рамках гэтай серыі будзе праведзены шэраг манеўраў пад агульнымі назвамі «Стойкі абаронца — 2024» і «Абаронца Еўропы — 2024». У вучэннях задзейнічаюць шматлікія воінскія кантынгенты ўсіх дзяржаў — членаў НАТА, а таксама Швецыі. Дадзеная ваенная дзейнасць адкрыта пазіцыянуецца як самая буйная за апошнія 40 гадоў. Па заявах прадстаўнікоў Альянсу, агульная колькасць асабовага складу, які прыцягваецца толькі да вучэння «Стойкі абаронца», складзе больш за 90 тысяч вайскоўцаў».

Асноўныя раёны правядзення вучэнняў наўмысна засяроджаны каля беларускіх граніц — у Польшчы і краінах Балтыі. «Пры гэтым, дэкларуючы прыхільнасць Венскаму дакументу 2011 года аб мерах умацавання даверу і бяспекі, дзяржавы — члены НАТА не забяспечваюць адкрытасць і транспарэнтнасць мерапрыемстваў баявой падрыхтоўкі, што ставіць пад сумненне іх абарончую накіраванасць, якая заяўляецца, — падкрэсліў памочнік міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва. — Маштабы, раёны правядзення, задачы, якія адпрацоўваюцца падчас вучэнняў «Абаронца-2024», дазваляюць зрабіць выснову, што яго канчатковай мэтай з'яўляецца праверка здольнасці аб'яднаных узброеных сіл НАТА і ўзброеных сіл краін-партнёраў у максімальна сціслыя тэрміны стварыць групоўкі войскаў (сіл) на «ўсходнім флангу» блока і правесці сумесную наступальную аперацыю аператыўна-стратэгічнага ўзроўню на беларускім і расійскім напрамках».

Асобна Валерый Равенка спыніўся на парушэннях Дзяржаўнай граніцы Беларусі з боку Латвіі, Літвы і Польшчы. Толькі са жніўня 2023 года зафіксавана шэсць падобных інцыдэнтаў у паветранай прасторы. Беларускія войскі знаходзяцца ў пастаяннай гатоўнасці адбіць любую агрэсію.

## Узаемапавага і баланс інтарэсаў

Неспрыяльнае геапалітычнае становішча абумовіла неабходнасць унясення прынцыповых змен у Ваенную дактрыну Рэспублікі Беларусь. Гэты найважнейшы стратэгічны дакумент будзе разгледжаны і вынесены на зацвярджэнне Усебеларускага народнага сходу, пасяджэнне якога пройдзе ў красавіку.

Кажучы аб ключавых пасылах Ваеннай дактрыны, начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва падкрэсліў, што Рэспубліка Беларусь — міралюбівая дзяржава, якая паважае палітычную незалежнасць і дзяржаўны суверэнітэт іншых краін і не разглядае ні адну дзяржаву або народ у якасці ворага.

«Мяркуем, што як супрацоўніцтва ў цэлым, так і супрацоўніцтва ў вайсковай сферы магчыма ажыццяўляць з усімі краінамі свету, — заўважыў ён. — Асноўныя ўмовы простыя: гэта раўнапраўнае, узаемавыгаднае і сумленнае партнёрства, якое заснавана на выкананні норм і прынцыпаў міжнароднага права і не прымае падвойныя стандарты. Рэспубліка Беларусь зацікаўлена ў аднаўленні ўплыву ААН і АБСЕ, а таксама ў выкарыстанні механізмаў дадзеных міжнародных арганізацый па прызначэнні, якое закладзена ў іх статутныя дакументы. Мы гатовы садзейнічаць зніжэнню напружанасці ў рэгіёне і свеце, развіццю мер даверу і бяспекі, сістэмы кантролю над узбраеннямі шляхам удзелу ў дзейнасці ААН і АБСЕ, аднак лічым, што высокая рэзультатыўнасць такой дзейнасці будзе магчыма толькі пры ўмове захавання прынцыпу роўнасці ўсіх дзяржаў і пры разуменні абсалютна ўсімі дзяржавамі-ўдзельніцамі неабходнасці знаходжання балансу інтарэсаў».

## Народнае апалчэнне і ваенна-патрыятычнае выхаванне

Кажучы аб будаўніцтве і развіцці Узброеных Сіл Беларусі, ваенны дыпламат звярнуў увагу на тэхнічнае пераўзбраенне нашай арміі, падрабязна спыніўся на мерапрыемствах аператыўнай і баявой падрыхтоўкі ў 2022/2023 навучальным годзе, у тым ліку ў рамках АДКБ, патлумачыў прычыны стварэння ў нашай краіне сістэмы тэрытарыяльнай абароны, асаблівасцях фарміравання атрадаў народнага апалчэння.

Апошняе, па словах Валерыя Равенкі, будзе заснавана на прынцыпах добраахвотнасці і законнасці. Дзейнічаць атрады народнага апалчэння будуць толькі ў перыяд ваеннага становішча. «Задачай удзельнікаў апалчэння з'яўляецца падтрыманне сумесна з органамі ўнутраных спраў правапарадку на тэрыторыі, дзе яны пражываюць, — канкрэтызаваў ён. — Пры распрацоўцы заканадаўства аб народным апалчэнні ўлічаны негатыўны вопыт Украіны, дзе бескантрольная выдача зброі прывяла да фактаў разбою, марадзёрства і бандытызму. Зброя і боепрыпасы падчас ваеннага становішча будуць выдавацца праз органы ўнутраных спраў правераным па спецыяльных уліках людзям, кіраўніцтва народным апалчэннем будзе ажыццяўляць мясцовы савет абароны, непасрэднае ўпраўленне — тэрытарыяльны орган унутраных спраў».

Асаблівую ўвагу памочнік міністра абароны засяродзіў на важнасці ваенна-патрыятычнага выхавання, якое праводзіцца ў нашай краіне. Аб эфектыўнасці гэтай работы сведчыць той факт, што летась больш за 14 тысяч падлеткаў сталі ўдзельнікамі спартыўна-патрыятычных лагераў, якія былі арганізаваны ў месцах дыслакацыі злучэнняў і воінскіх часцей Узброеных Сіл. У 2022—2023 гадах сфарміравана 155 ваенна-патрыятычных класаў, у якіх навучаліся старшакласнікі, якія, як правіла, звязваюць свой далейшы лёс з сілавымі ведамствамі.

У размове з журналістамі Валерый Равенка рэзюмаваў, што Беларусь змяніла вектар супрацоўніцтва з нашымі сябрамі і партнёрамі. «Мы больш не жадаем зазываць Захад, шукаць нейкія кантакты для памяншэння пагроз ваеннай бяспекі, — удакладніў ён. — Мы проста прыадчынілі дзверы: калі ім неабходна — няхай прыходзяць, мы будзем размаўляць. Беларусь устанавіла кантакты з краінамі Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. Міністр абароны здзейсніў візіты ў Індыю, Кітай, Іран, літаральна нядаўна быў візіт на Кубу, у Расію, зразумела. Было дасягнута мноства дамоўленасцяў. У нас шмат сяброў і партнёраў. Мы ведаем, куды ісці».

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

**Пасля брыфінгу прадстаўнікі ваенна-дыпламатычнага корпуса, акрэдытаваных пры Міністэрстве абароны Беларусі, падзяліліся сваімі меркаваннямі.**

**Аташэ па пытаннях абароны пры Пасольстве Арабскай Рэспублікі Егіпет у Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь (па сумяшчальніцтве) генерал-маёр Ваэль ЭЛЕСАВІ** падзякаваў за арганізацыю яго візіту ў нашу краіну, асабліва — за магчымасць пабываць на Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь. «Мы змаглі азнаёміцца з усімі аспектамі яе работы, — адзначыў ён. — Удзячны за брыфінг, падчас якога мы атрымалі актуальную інфармацыю. Хацеў бы вярнуцца на вашу гасцінную беларускую зямлю».

Карысным назваў наведванне Дзяржаўнай граніцы Беларусі з Літвой і **ваенны аташэ пры Пасольстве Замбіі ў Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь (па сумяшчальніцтве) брыгадны генерал Клемент ДЖЭРЭ.** «Гэтая паездка была вельмі плённая, бо ахова дзяржграніцы заўсёды дазваляе захоўваць суверэнітэт і бяспеку дзяржавы, — звярнуў увагу ён. — Мы азнаёміліся з работай пагранічных пераходаў, органаў пагранічнай службы, убачылі, як яны выконваюць свае задачы. Лічу, што гэта вельмі добры вопыт для нас. Акрамя таго, мы азнаёміліся з размяшчэннем салдат, з тым, як працуе кіналагічная служба ў межах аховы граніцы. Падчас гэтага візіту я адзначыў многае, што можна выкарыстаць у нас на граніцы».

Гонар служыць

**Гісторыя іх кахання пачалася яшчэ ў школе. Цікава, што агульныя інтарэсы прывялі маладых людзей у Полацкі дзяржаўны эканамічны каледж. Затым Уладзіслаў пайшоў у армію: замест тэрміновай службы ён заключыў з воінскай часцю кантракт. Звязаць сваё жыццё з Узброенымі Сіламі вырашыла і Ганна. Так, у адным палку ўжо муж і жонка будавалі сваю ваенную кар'еру. Раптам паступіла прапанова, ад якой ні ён, ні яна не маглі адмовіцца...**

# СЯМЕЙНЫ ВЫБАР

## Курсанты Ваеннай акадэміі Ганна і Уладзіслаў БАСІКІ разам крочаць да афіцэрскіх пагонаў



Сёння Уладзіслаў і Ганна Басікі — курсанты Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Вучацца на адным з найбольш папулярных у абітурыентаў факультэце — ваеннай разведкі. Муж і жонка асвойваюць усе тонкасці радыёэлектроннай барацьбы, каб у перспектыве папоўніць шэрагі інтэлектуалаў беларускай арміі, як называюць спецыялістаў гэтага роду войск.

### З ЭКАНАМІСТАЎ І ПРАГРАМІСТАЎ — У ВАЕННАСЛУЖАЧЫЯ

Пакуль ідзём да корпуса, дзе праходзяць заняткі, сужэнцы расказваюць, як так атрымалася, што яны абодва вызначыліся з прафесійным выбарам на карысць афіцэрскай прафесіі. Маладыя людзі папоўнілі шэрагі кузні ваенных кадраў краіны ў жніўні 2023 года, але мара аб афіцэрскіх пагонах у іх з'явілася значна раней.

Ганна нарадзілася ў Наваполацку. Пасля заканчэння школы паступіла ў Полацкі дзяржаўны эканамічны каледж. Асвойвала юрыдычную прафесію. Так склалася, што па заканчэнні навучальнай установы веды маладога спецыяліста спатрэбіліся ў адной з воінскіх часцей Полацка — у 10-м асобным батальёне радыёэлектроннай барацьбы. Будучы на цывільнай пасадзе, на працягу сямі месяцаў дзяўчына займалася юрыдычнымі пытаннямі падраздзялення. Пасля паступіла на службу па кантракце ў 228-ы асобны полк радыёэлектроннай барацьбы, у якім, дарэчы, служыў і яе муж.

Уладзіслаў таксама трапіў ва Узброеныя Сілы пасля заканчэння сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы. Калі праграмісту прыйшла павестка ў армію, гэта не стала нечаканасцю. Малады чалавек нарадзіўся і жыў у Полацку. З самага дзяцінства рос у асяроддзі ваеннаслужачых. У розны час афіцэрскія пагоны насілі яго два дзядулі (адзін з'яўляецца афіцэрам міліцыі ў адстаўцы) і айчым. Апошні якраз служыць, на падпалкоўніка Узброеных Сіл раўняецца і Улад. Невыпадкова замест праходжання тэрміновай ваеннай службы хлопец вырашыў скарыстацца правам адразу заключыць з воінскай часцю кантракт.

«У кантрактнай службы шмат пераваг, — заўважае малады Уладзіслаў Басік. — Па-першае, ёсць магчымасць застацца ў родным горадзе. Па-другое, жывеш ты не ў казарме, як салдаты тэрміновай службы, а дома. Па-трэцяе, няма неабходнасці надоўга расставацца з блізкімі. Немалаважна і тое, што ў гэты час служба становіцца тваёй працай, за якую атрымліваеш заробак. Для жанатага чалавека гэта істотны момант. І, нарэшце, для хлопцаў, якія па пэўнай прычыне не паступілі ў ваенную навучальную ўстанову, але мараць аб афіцэрскім званні, гэта добрая прыступка ў прафесіі».

У 228-м асобным палку РЭБ, дзе да Ваеннай акадэміі праходзілі службу сужэнцы Басікі, Ганне давялося асвойваць ваенную спецыяльнасць. У задачы аператара станцыі радыёперашкод у тым ліку ўваходзіла выяўляць крыніцы радыёвыпраменьвання і паведамляць аб гэтым дзяжурнаму. «Спачатку было складана ўнікнуць ва ўсе тонкасці, — прызнаецца Ганна. — Аднак, дзякуючы добраму калектыву, разуменне, што і як трэба рабіць, прыйшло хутка. Служыць мне вельмі падабаецца».

Дзяўчына добра памятае той дзень, калі муж прыйшоў з навін: ён плануе паступаць у Ваенную акадэмію. Прапанаваў папоўніць курсанцкія шэрагі разам. Яна доўга не думала: яшчэ будучы на цывільнай пасадзе, як толькі прыйшла ў воінскую часць, задумалася аб атрыманні ваеннай адукацыі. Такім чынам, рашэнне было прынята хутка і бескампрамісна.

Блізкія іх падтрымалі. Ганна прызнаецца, што толькі яе бабуля была не ў захапленні ад такога рашэння сваёй унучкі: маўляў, не жаночая гэта справа, асабліва ў святле сучаснай ваенна-палітычнай абстаноўкі. «Цяпер жа бабуля памяняла сваё меркаванне, ганарыцца мной, чакае, калі атрымаю лейтэнанцкія пагоны», — заўважае дзяўчына.



### КУРСАНТЫ САМАЙ ПАПУЛЯРНАЙ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

На факультэце ваеннай разведкі Ганна і Уладзіслаў Басікі вучацца па самай папулярнай спецыяльнасці ў Ваеннай акадэміі — «Эксплуатацыя сродкаў радыёманіторынгу і супрацьдзеяння». Дарэчы, факультэт з'яўляецца адзіным у сістэме ваеннай адукацыі краіны, які рыхтуе спецыялістаў радыёэлектроннай барацьбы. Невыпадкова конкурс сюды заўсёды высокі. Напрыклад, у мінулую ўступную кампанію кантрольныя лічбы набору на гэтую спецыяльнасць былі выкананы літаральна за два дні.

Муж і жонка Басікі ганарацца тым, што ім пашчасціла асвойваць гэтую цікавую ваенную спецыяльнасць. Але нягледзячы на вопыт службы ў войсках, спасцігаць ваенную справу няпроста. Трэба добра разбірацца ў дакладных навуках, быць уседлівым і ўдумлівым.



Курсантам Басікам пашанцавала: вучыцца разам прасцей. Калі нешта не разумее Ганна, ёй абавязкова дапаможа Улад. У той жа час ёсць прадметы, з якімі найлепш спраўляецца жонка.

Дарэчы, іх гісторыя кахання пачалася яшчэ ў школе. Пажаніліся адразу пасля заканчэння каледжа, у чэрвені 2021 года. З таго часу не расстаюцца. Падтрымліваюць адзін аднаго ва ўсім. Уладзіслаў не лічыць, што служыць у арміі павінны выключна мужчыны. «Ёсць воінскія спецыяльнасці, з якімі найлепш спраўляюцца менавіта жанчыны, — перакананы ён. — Сучасныя жанчыны вельмі актыўныя, ім многае па сілах. Калі ў жонкі ўзнікнуць пэўныя складанасці ў чымсьці, я абавязкова прыйду на дапамогу».

Ганна настолькі прызвычаілася да ваеннай формы, што не заўсёды хочацца яе здымаць: «Свабодна, лёгка, лепш, чым у паўсядзённай».

Выкладчыкі акадэміі, калі знаёмяцца з курсантамі і бачаць у журнале дваіх чалавек з адным прозвішчам, адразу думаюць, што Улад і Ганна — брат і сястра. Здзіўляюцца, калі даведваюцца, што сужэнцы. Нярэдка ў ваеннай альма-матар ствараюцца сем'і, але такое, каб сямейнай пары прыходзілі сюды, — выпадак рэдкі.

Як адзначае **намеснік начальніка факультэта ваеннай разведкі па вучэбнай і навуковай рабоце Ваеннай акадэміі палкоўнік Дзмітрый ДОЎГЕР**, праблем з навучаннем у сямейнай пары няма. «Яны разумеюць прызначэнне таго ці іншага ўзбраення, станцыі, маюць практычны вопыт іх эксплуатацыі, — удакладняе ён. — Навучанне ў акадэміі раскрывае прынцыпы работы, дапамагае ў далейшым больш якасна выконваць пастаўленыя задачы. Будзем выхоўваць у курсантаў высокапрафесійных спецыялістаў радыёэлектроннай барацьбы, сапраўдных абаронцаў Айчыны».

Дарэчы, Дзмітрый Доўгер — выпускнік Ваеннай акадэміі. У свой час таксама навучаўся на кафедры радыёэлектроннай разведкі і радыёэлектроннай барацьбы. Праходзіў службу ў падраздзяленнях РЭБ. Пасля заканчэння камандна-штабнога факультэта Ваеннай акадэміі стаў выкладаць будучым афіцэрам.

«Ваенная акадэмія пераймае перадавы вопыт канфліктаў апошніх дзесяцігоддзяў, што своечасова ўкараняецца ў адукацыйны працэс, — звяртае ўвагу намеснік начальніка факультэта ваеннай разведкі па вучэбнай і навуковай рабоце. — Напрыклад, у межах спецыяльнай ваеннай аперацыі асаблівая ўвага — радыёэлектроннай барацьбе. Яна паказала сваю значнасць, эфектыўнасць. Адпаведна развіваюцца падраздзяленні радыёэлектроннай барацьбы нашых Узброеных Сіл. У сувязі з гэтым мы ўдасканальваем і навучальны працэс, рыхтуем курсантаў да таго, што іх можа чакаць падчас службы».

### ЖЫЦЦЁ ПА РАСПАРАДКУ

Нягледзячы на тое, што курсанты Басікі — муж і жонка, распарадак дня ў іх нічым не адрозніваецца ад іншых хлопцаў і дзяўчат. Ранні пад'ём, зарадка, сняданак, заняткі, баявая, страявая і фізічная падрыхтоўкі, самападрыхтоўка, асабісты час, адбой — і так кожны дзень. Выключэнне — нядзеля. Курсанцкая субота таксама прадугледжвае навучанне і шэраг абавязковых мерапрыемстваў.

Адзінае, што сужэнцы Басікі адпачываюць не ў казармах, як іх таварышы. Муж і жонка займаюць асобны пакой у інтэрнаце. Калі ёсць час, Ганна завіхаецца на агульнай кухні. Харчаванне ў акадэміі трохразовае, але, як гэта часта бывае ў жанчын, яна любіць парадаваць другую палавінку сваёй стравай. Улад прызнаецца, што Аня гатуе найсмачнейшую ў свеце салянку, таксама любіць піцу і салаты.

Кожны вечар курсанты маюць права пакідаць навучальную ўстанову і, напрыклад, накіравацца ў тэатр або па ўласных справах. Ганна і Улад такой магчымасцю не карыстаюцца — шмат часу займае самападрыхтоўка. Выхадныя дні — іншая справа. Раней, як яны расказваюць, нярэдка ездзілі на радзіму, сустракаліся з бацькамі, іншымі сваякамі. Апошнім часам, як правіла па нядзелях, знаёмяцца з Мінскам. Прызнаюцца, што жыць у сталіцы цікава: шмат музеяў, тэатраў, гандлёвых цэнтраў, паркаў адпачынку.

Напярэдзе ў сужэнцаў Басікаў — крыху больш як тры гады навучання. У адрозненне ад сваіх таварышаў-курсантаў, яны добра разумеюць, што іх чакае падчас службы. Маючы хоць і невялікі вайсковы вопыт, Ганна і Уладзіслаў усведамляюць, якія задачы ім давядзецца выконваць, а таму яшчэ цікавей рухацца ў напрамку афіцэрскіх пагон. Пакуль — лейтэнантскія. А планы, між іншым, у курсантаў — вялікія. А калі адна мэта на дваіх, то дасягнуць яе нескладана: сакрэт поспеху — у сямейным выбары.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

И З В Е Щ Е Н И Е

## ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ «МИНСКСТРОЙ»

доводит до сведения заинтересованных лиц информацию о внесении изменений и дополнений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений и машино-мест в составе объекта **«Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Первая очередь строительства. Жилой дом № 2 по ГП. Многоуровневая гараж-стоянка № 3.1 по ГП,** *опубликованную в газете «Звязда» от 17.05.2023 № 92 (29972) с дополнениями от 30.05.2023 № 101 (29981), от 16.06.2023 № 114 (29994), от 28.07.2023 № 144 (30024), от 25.08.2023 № 164 (30044), от 08.09.2023 № 174 (30054), от 04.10.2023 № 192 (30072), от 16.12.2023 № 244 (30124):*

**Объект долевого строительства – квартира с машино-местом, квартира без машино-места.**

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации:**

Срок начала строительства объекта – 29 апреля 2023 года.

Нормативная продолжительность строительства объекта 18 месяцев.

Предполагаемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода в эксплуатацию в соответствии с проектом организации строительства – 28 октября 2024 года.

**Условия ознакомления с объектами долевого строительства и ходом работ по ним:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

**Для заключения договоров создания объекта долевого строительства** (далее – договор) на дату опубликования настоящих изменений и дополнений в декларацию предлагаются 44 (сорок четыре) квартиры с учетом приобретения машино-места, находящихся на 1-5 уровнях в гараж-стоянке № 3.1 по генплану в составе объекта строительства, в том числе:

**4 (четыре) однокомнатные квартиры:**
- № 2 (общая площадь 45,94 кв. м);
- № 44 (общая площадь 43,26 кв. м);
- № 45 (общая площадь 46,1 кв. м);
- № 107 (общая площадь 43,19 кв. м).

**1 (одна) двухкомнатная квартира:**
- № 131 (общая площадь 63,97 кв. м).

**30 (тридцать) трехкомнатных квартир:**
- № 5 (общая площадь 91,17 кв. м);
- № 8, № 20, № 23, № 26 (общая площадь 87,96 кв. м каждая);
- № 9, № 12, № 15, № 18, № 21, № 24, № 27, № 30 (общая площадь 80,68 кв. м каждая);
- № 11, № 14 (общая площадь 90,3 кв. м каждая);
- № 17 (общая площадь 90,48 кв. м);
- № 29 (общая площадь 90,16 кв. м);
- № 32 (общая площадь 90,04 кв. м);
- № 33, № 39 (общая площадь 80,34 кв. м каждая);
- № 35 (общая площадь 90,12 кв. м);
- № 36 (общая площадь 80,34 кв. м);
- № 38 (общая площадь 87,74 кв. м);
- № 46 (общая площадь 80,75 кв. м);
- № 59 (общая площадь 85,93 кв. м);
- № 106 (общая площадь 85,96 кв. м);
- № 109 (общая площадь 80,75 кв. м);
- № 178 (общая площадь 92,39 кв. м);
- № 217 (общая площадь 81,31 кв. м);
- № 289 (общая площадь 83,32 кв. м).

**9 (девять) четырехкомнатных квартир:**
- № 1 (общая площадь 124,74 кв. м);
- № 16, № 19, № 28 (общая площадь 135,15 кв. м каждая);
- № 22, № 25 (общая площадь 134,91 кв. м каждая);
- № 31 (общая площадь 134,88 кв. м);
- № 34, № 37 (общая площадь 134,64 кв. м каждая).

**Цены на объекты долевого строительства:**

Стоимость строительства 1 м² общей площади объектов долевого строительства без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

| Номер квартиры | Подъезд | Этаж | Количество комнат | Площадь жилого помещения (квартиры), м² | Стоимость 1 м² при 100 % оплате, бел. рублей | Стоимость 1 кв. м при рассрочке платежей, при условии кредитования в рамках партнерских кредитных программ*, бел. рублей | Стоимость 1 м² машино-место, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2, 44, 45, 107 | 1-3 | 1 | 1 | 43, 19-46, 10 | 4 500,00 | 4 687,00 | 1 595,68 |
| 131 | 3 | 7 | 2 | 63, 97 | 4 100,00 | 4 271,00 | |
| 46, 106, 109, 178, 217 | 2-5 | 1,4 | 3 | 80, 75-92, 39 | 3 800,00 | 3 958,00 | |
| 59, 289 | 2, 6 | 1,5 | 3 | 83, 32-85, 93 | 4 000,00 | 4 166,00 | |
| 5, 8, 9, 11, 12, 14, 15 | 1 | 2-5 | 3 | 80, 68-91, 17 | 4 300,00 | 4 479,00 | |
| 17, 18, 20, 21, 23, 24, 26, 27, 29, 30, 32, 33, 35, 36, 38, 39 | 1 | 6-13 | 3 | 80, 68-90, 48 | 4 600,00 | 4 791,00 | |
| 1 | 1 | 1 | 4 | 124, 74 | 4 000,00 | 4 166,00 | |
| 16, 19, 22, 25, 28, 31, 34, 37 | 1 | 6-13 | 4 | 134, 64-135, 15 | 4 500,00 | 4 687,00 | |

**Банками партнерами являются ОАО «АСБ Беларусбанк», ОАО «Белинвестбанк»*

Также для заключения договоров на дату опубликования настоящих изменений и дополнений в декларацию предлагается одна квартира без приобретения машино-места:

**1 (одна) двухкомнатная квартира:**
- № 170 (общая площадь 69,53 кв. м).

| Номер квартиры | Подъезд | Этаж | Количество комнат | Площадь жилого помещения (квартиры), м² | Стоимость 1 м² при 100 % оплате, бел. рублей | Стоимость 1 кв. м при рассрочке платежей, при условии кредитования в рамках партнерских кредитных программ*, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 170 | 4 | 1 | 2 | 69,53 | 3600,00 | 3 750,00 |

Также сообщаем о внесении изменений в декларацию, в части возможности заключения договоров с учетом приобретения машино-места, находящегося на любом уровне в гараж-стоянке № 3.1 по генплану в составе объекта строительства.

**Стоимость строительства 1 м² общей площади объектов долевого строительства без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах при условии оплаты согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства составляет:**

двухкомнатная квартира, расположенная в 4-м подъезде № 179 стоимостью 1 кв. м 3 646,00 белорусских рублей;

**Условия оплаты для квартир, содержащихся в настоящем извещении:**

при условии единовременной оплаты **жилого помещения и машино-места (жилого помещения без машино-места)** расчет должен быть произведен дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при условии единовременной оплаты **жилого помещения,** расчет должен быть произведен дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме и при оплате **машино-места** согласно графику платежей, размер первоначального взноса составляет 40 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства по сентябрь 2024 года. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при условии оплаты **жилого помещения и машино-места (жилого помещения без машино-места)** согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства первоначальный взнос по жилому помещению и машино-месту составляет 40 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства по сентябрь 2024 года. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при кредитовании в рамках партнерской кредитной программы финансирования строительства оплата по объекту долевого строительства производится единовременно в полном объеме стоимости объекта. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 25 (двадцати пяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

Заявления о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) со следующего дня после публикации настоящего извещения о внесении дополнений и изменений в проектную декларацию в порядке очереди по адресу: ул. К. Маркса, 13а, каб. 105. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться после получения уведомления от ГПО «Минскстрой» (по средствам телефонной связи, сообщения в Viber, Telegram), но не ранее 7 (семи) календарных дней после опубликования настоящей декларации по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 с физическими и юридическими лицами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:

для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность), доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта (биометрического документа удостоверяющего личность) представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве после уведомления не явился в течение 3 рабочих дней для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки в Viber, Telegram, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

ГПО «Минскстрой» имеет право отказать в заключении договора создания объекта долевого строительства без объяснения причин.

Условия декларации, не измененные (не исключенные) настоящим извещением, остаются неизмененными.

Подробные сведения об объекте строительства, планировках квартир и ходе строительства можно получить в отделе реализации объектов недвижимости и жилья по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, тел. моб. +375 29 195 18 21, либо на сайтах: https://minskstroy.by, http://www.uyutnyi.by.

## Информация о проведении аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 24-63-12, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Лот № 1.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части кап. строения с инв. № 200/С-53951 (наименование – отделение связи № 26, назначение – здание специализированное связи) – помещения площадью 18,3 кв. м, расположенного на 2-м этаже кап. строения по адресу: г. Витебск, ул. Советская, 13 для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0.

**Нач. цена: 77,32 бел. руб.**

**Лот № 2.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части кап. строения с инв. № 200/С-53951 (наименование – отделение связи № 26, назначение – здание специализированное связи) – помещения площадью 7,7 кв. м, расположенного на 3-м этаже кап. строения по адресу: г. Витебск, ул. Советская, 13 для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0.

**Нач. цена: 32,53 бел. руб.**

**Лот № 3.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части кап. строения с инв. № 200/С-53951 (наименование – отделение связи № 26, назначение – здание специализированное связи) помещения площадью 10,8 кв. м, расположенного на 3-м этаже кап. строения по адресу: г. Витебск, ул. Советская, 13 для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0.

**Нач. цена: 45,63 бел. руб.**

**Лот № 4.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части кап. строения с инв. № 200/С-53951 (наименование – отделение связи № 26, назначение – здание специализированное связи) – помещений общей площадью 19,2 кв. м (5,8; 13,4), расположенных на 2-м этаже кап. строения по адресу: г. Витебск, ул. Советская, 13 для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0.

**Нач. цена: 81,12 бел. руб.**

**Лот № 5.** Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части кап. строения с инв. № 200/С-53951 (наименование – отделение связи № 26, назначение – здание специализированное связи) – помещения площадью 20,9 кв. м, расположенного на 3-м этаже кап. строения по адресу: г. Витебск, ул. Советская, 13 для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3,0.

**Нач. цена: 88,30 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения аукциона: 14.03.2024 в 15.00** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Извещение о проведении аукциона опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by (№ 22141), на сайте Витебского облисполкома https://vitebsk-region.gov.by/ru/Aukciony-ru.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00028** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** учреждение образования «Молодечненский торгово-экономический колледж» Белкоопсоюза, 222310, Минская обл., г. Молодечно, пл. Центральная, 1, тел. 8 (0176) 777569.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных электронных торгов 13 марта 2024 г. в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 250/С-1833 площадью 2027,9 кв. м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б, 1959 г. п., наименование – административное здание, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: цокольный этаж. Кап. строение с инв. № 250/С-25204 площадью 54,1 кв. м по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б/1, год постройки не установлен, наименование – здание гаража, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Кап. строения находятся на зем. участке с кадастровым № 243500000004000064 площадью 0,1852 га по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Нижне-Покровская, 41Б, целевое назначение – зем. участок для содержания и обслуживания объектов административного назначения и гаража (право постоянного пользования).

**Обременения:** договоры аренды, с условиями которых можно ознакомиться по предварительному согласованию с Продавцом.

**Нач. цена: 1 517 292,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.**

**Задаток: 151 729,20 бел. руб.**

Повторные электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by» с учетом Рекомендаций по отчуждению имущества организациями потребительской кооперации, утвержденными постановлением Правления Белкоопсоюза 30.08.2019 № 263 с изм. и доп.

Для участия в торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами по торгам: **до 16.00 12.03.2024.**

*Задаток по электронным торгам перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK301 20001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Код категории назначения перевода: для юр. лиц и индивид. предпринимателей – OTHR; для физ. лиц – MP2B (платеж с текущего (расчетного) банковского счета физ. лица) или CASH (платеж наличными в кассе банка). Код назначения платежа – 40901 (перечисление гарантийного взноса).*

**Условия повторных электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки имущества и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета эл. торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов и утверждения протокола эл. торгов; оплатить предмет эл. торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи.

Расходы продавца на проведение независимой оценки составляют 873,83 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

Имущество, бывшее в употреблении. Победитель эл. торгов (претендент на покупку) приобретает объект по фактическому состоянию с учетом возможности наличия скрытых дефектов.

С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в эл. торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by – в разделе «недвижимое имущество» – «административные здания и помещения». Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения торгов, отказаться от проведения торгов.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом: Ковшель Зинаида Сергеевна, +375 29 8142660.

# МЮНХЕНСКІ ТУПІК

## Чым адзначылася юбілейная канферэнцыя па бяспецы?

**НАПРЫКАНЦЫ мінулага тыдня ў Германіі прайшла Мюнхенская канферэнцыя па бяспецы. Яна арганізуецца з 1963 года — сёлетні форум быў юбілейным, шасцідзясятым. Лічылася, што канферэнцыя з'яўляецца пляцоўкай для абмеркавання актуальных праблем міжнароднай бяспекі сярод кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, міністраў замежных спраў і абароны, парламентарыяў, а таксама прадстаўнікоў СМІ і навукі. Як лічаць эксперты, цяпер сітуацыя змянілася. Як заявіў РІА «Новости» доктар палітычных навук, прафесар РАН Аляксандр Гусеў, раней Мюнхенская канферэнцыя «прадстаўляла сапраўды сур'ёзную пляцоўку, на якой не толькі абмяркоўваліся праблемы, але і прымаліся адпаведныя рашэнні, дамаўляліся». «Цяпер гэтая пляцоўка ператварылася ў гаварыльню», — лічыць эксперт. Чым жа адзначылася сёлетняя юбілейная канферэнцыя па бяспецы?**




### УЗАЕМНЫ ПРОЙГРЫШ

Святочнага настрою сярод шматлікіх высакапастаўленых удзельнікаў Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы зусім не адчувалася. Што атмасфера ў фешэнебельным атэлі Bayerischer Hof, дзе праходзіў форум, будзе хутчэй трывожнай і песімістычнай, стала зразумела яшчэ напярэдадні, калі выйшаў штогадовы аналітычны даклад «Munich Security Report» аб стане спраў у Еўра-Атлантыцы і свеце. У гэтым годзе дакумент быў азагалоўлены «Lose-Lose?», што можна ўмоўна перакласці як «Узаемны пройгрыш?», паведаміў kommersant.ru. У прэамбуле да даклада гаварылася аб «негатыўных тэндэнцыях у сусветнай палітыцы», «росце геапалітычнай напружанасці і эканамічнай нявызначанасці». Згодна з маштабным апытаннем, праведзеным сацыёлагамі ў 11 краінах у рамках падрыхтоўкі даклада, значная частка насельніцтва дзяржаў G7 лічыць, што праз дзесяць гадоў яны стануць менш абароненымі і бяднейшымі. Найбольш змрочныя настроі даследчыкі зафіксавалі ў Японіі і Германіі, а найбольш аптымістычныя — у ЗША і Вялікабрытаніі. Але і ў апошніх дзвюх краінах толькі 20—33 працэнты рэспандэнтаў выказалі ўпэўненасць у тым, што іх дзяржавы будуць больш бяспечнымі і багатымі ў будучыні, у той час як у Кітаі і Індыі гэты паказчык склаў 57—63 працэнты. «Геапалітычны і эканамічны аптымізм эпохі пасля заканчэння «халоднай вайны» вычарпаўся», — канстатавалі складальнікі даклада.

З выступлення генеральнага сакратара ААН вынікала, што пытальнік у назву даклада да сёлетняй Мюнхенскай канферэнцыі можна было б і не ставіць. Цяперашні светапарадак, паводле ацэнкі Антоніу Гутэрыша, мала для каго працуе. «Насамрэч, я скажу так: ён увогуле ні для кога не працуе, — прызнаў генеральны сакратар ААН. — Відавочна, што наш свет знаходзіцца ў глыбокім крызісе. Глабальнае кіраванне ў яго цяперашняй форме ўкараняе рознагалоссі і распальвае незадаволенасць». Па словах Антоніу Гутэрыша, «свет сутыкаецца з экзістэнцыйнымі выклікамі», у той час як «сусветная супольнасць знаходзіцца ў самым расколатым і раз'яднаным стане за апошнія 75 гадоў». «Нават эра халоднай вайны была ў некаторым сэнсе менш пагрозлівая», — заявіў ён, дадаўшы, што сёння дзяржавы «робяць усё, што ім заманецца, не несучы ніякай адказнасці». Сярод бягучых гарачых пунктаў Антоніу Гутэрыш асабліва вылучыў эскалацыю на Блізкім Усходзе і канфлікт вакол Украіны. «Сітуацыя ў Газе — гэта жахлівы доказ таго, што глабальныя адносіны знаходзяцца ў тупіку, — адзначыў ён. — Узровень смерцяў і разбурэнняў шакіруе. Вайна перакідваецца праз граніцы і ўплывае на сусветны гандаль».

### ДЭГРАДАЦЫЯ ПЛЯЦОЎКІ

Афіцыйны прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Расіі Марыя Захарава напярэдадні канферэнцыі падчас брыфінгу адзначыла, што «за апошнія гады мы назіралі паслядоўную дэградацыю мюнхенскай пляцоўкі. Памятаю, як пачаліся гэтыя відавочна выяўленыя крызісныя з'явы, у тым ліку калі пачаў дамінаваць толькі адзін бок на Мюнхенскай канферэнцыі — ЗША, — заявіла яна. — Дзіка назіраць, як Злучаныя Штаты, прадстаўляючы іншы кантынент, дыктуюць сваім сатэлітам і парадак дня, і высновы, да якіх канферэнцыя павінна прыйсці».

«Звярнулі ўвагу на маркотную атмасферу сустрэчы. Ад былога аптымізму заходнікаў не засталося і следу», — адзначыла дыпламат па выніках канферэнцыі. — Калі год таму яны былі поўныя ўпэўненасці ў хуткай перамозе сваіх кіеўскіх марыянетак, то на гэты раз ледзь хавалі скепсіс і песімізм. Мабыць, у Еўропе і ЗША пачынаюць разумець немагчымасць нанесці паражэнне Расіі».

Пры гэтым афіцыйны прадстаўнік МЗС РФ падкрэсліла, што міжнародная супольнасць павінна самым сур'ёзным чынам паставіцца да пагроз прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага перагледзець адмову краіны ад ядзернай зброі: «У лютым 2022 года Зяленскі ў сваім выступленні на той жа Мюнхенскай канферэнцыі прыгразіў перагледзець адмову Кіева ад ядзернай зброі. Пераканаными, што міжнародная супольнасць павінна самым сур'ёзным чынам ставіцца да падобных небяспечных заяў. Тым больш што ва Украіны з часоў СССР яшчэ захаваўся навуковы і вытворчы патэнцыял для вытворчасці ядзерных узбраенняў».

Еўрапейскія саюзнікі ЗША, мяркуючы па выступленнях на сцэне і размовах у кулуарах канферэнцыі, усё больш актыўна рыхтуюцца да таго, што ўлада ў Белым доме можа змяніцца і ім давядзецца самім гарантаваць сваю бяспеку і падтрымліваць Украіну. На гэтым фоне больш прыкметную ролю ў еўрапейскіх справах ужо зараз імкнуцца адыграваць Германія і Францыя. Абедзве краіны ўжо заявілі аб намеры павысіць траты на ваенныя патрэбы (пакуль ні Берлін, ні Парыж не выконваюць патрабаванні НАТА аб выдзяленні на абарону двух працэнтаў ад свайго ВУП). Канцлер ФРГ Олаф Шольц і прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон падпісалі з прэзідэнтам Украіны Уладзімірам Зяленскім пагадненні аб умацаванні супрацоўніцтва ў сферы бяспекі.

Пры гэтым днямі стала вядома, што ў Францыі маюць намер аспрэчыць у дзяржсавеце пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы бяспекі, падпісаны дакумент. Пра гэта паведаміла ТАСС. На сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы лідар палітычнага руху «Уставай, Францыя» Нікаля Дзюпон-Эньян напісаў: «Ніякага галасавання ў парламенце пасля падпісання дамовы аб бяспецы паміж Францыяй і Украінай і адпраўкі мільярдаў Зяленскаму. Макрон топча нашу канстытуцыю. Мы з сенатарам Аленам Уперам перадаём справу ў Дзяржаўны савет». Раней дэпутат Еўрапарламента ад Францыі Цьеры Марыяні назваў вар'яцкай суму ў тры мільярды еўра, якую Парыж гатовы выдзеліць Кіеву на фоне высокага ўзроўню дзярждоўгу самой Францыі, які перавышае тры трыльёны еўра.

### ПРЫВІД ТРАМПА

Лідары Еўрасаюза пачалі абмяркоўваць стварэнне структур, якія змаглі б дапоўніць або замяніць сабой НАТА з-за апасенняў, што экс-прэзідэнт ЗША Дональд Трамп пераможа на выбарах, якія маюць адбыцца, і скароціць падтрымку альянсу. Аб гэтым піша The Washington Post. Як адзначаецца ў матэрыяле, падчас Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы афіцыйныя асобы ЗША і Еўропы «рэкламавалі трывалую трансатлантычную салідарнасць», хоць адбывалася гэта на фоне таго, што Кангрэс ЗША затрымаў дапамогу Украіне на суму каля $60 млрд. А на гарызонце маячаць выбары ў ЗША. Вось ужо некалькі месяцаў большая частка Еўропыназірае за палітыкай Злучаных Штатаў Амерыкі з вялізным страхам, бачачы слабасць цяперашняга амерыканскага лідара Джо Байдэна і асцерагаючыся вяртання ў Белы дом Дональда Трампа. «Еўропа занепакоена і абураная, але не ведае, што рабіць далей», — адзначае The Washington Post. У Мюнхене «прывід Трампа» дамінаваў у закулісных размовах, як ніколі раней, зауважыла выданне.

Мантру «Расія не павінна перамагчы» паўтаралі ў Мюнхене практычна ўсе без выключэння заходнія палітыкі, адзначыла ТАСС. Ніхто не казаў пра мірную будучыню ў Еўропе, як яе дасягнуць, агульную архітэктуру бяспекі. З вуснаў не сыходзіла слова «вайна». Лідары заходніх краін з году ў год паўтараюць адно і тое ж пра нібыта пагрозу, якая ісіуе з боку Расіі. На гэта ў эфіры тэлеканала «Салаўёў Live» звярнуў увагу палітолаг Фархад Ібрагімаў, каментуючы мінулую Мюнхенскую канферэнцыю па бяспецы. «Мусіць, больш бракуе фантазіі. Пераліваюць з пустога ў парожняе, з году ў год паўтараюць адно і тое ж. Як заўсёды, прыдумляюць нейкія міфічныя пагрозы. Калі ўдумацца, пра што яны гавораць, мне здаецца, гаворка не змянілася. Яны як быццам паўтарылі ўсё, што казалі два гады таму і на працягу ўсяго гэтага часу», — адзначыў Фархад Ібрагімаў.

Пры гэтым, паводле слоў палітолага, на канферэнцыі былі асобы, якіх трэба было паслухаць. «Гэта той жа міністр замежных спраў Кітая Ван І. Ён дакладна даў зразумець, што КНР цырымоніцца не будзе з праявай агрэсіі з боку Захаду па тайваньскім пытанні. Але калі глядзець у цэлым на парадак дня сустрэчы, гэта было проста агрэсіўнае выражэнне сваіх эмоцый і пачуццяў, каб паказаць, што яны як быццам адзіныя. Насамрэч, у НАТА ніякага адзінства няма, — перакананы эксперт. — Але яны спрабуюць яго паказаць, заяўляюць, што гатовы змагацца з уяўнай расійскай пагрозай у Еўропе».

### ЗАХАД У РОСПАЧЫ

На форуме дамінавалі песімізм і пачуццё нявызначанасці, заўважыла амерыканскае выданне Bloomberg. Еўрапейцы бачаць, што Расія натхнёная сваімі ваеннымі поспехамі, а ЗША згортваюць дапамогу Украіне. Пры гэтым Вашынгтон можа скараціць ваенную падтрымку не толькі Кіева, але і ўсяго еўрапейскага рэгіёна. І гэта выклікае сур'ёзную трывогу ў еўрапейскіх лідараў.

Сенатар-рэспубліканец ад Агаё Джэймс Дэвід Вэнс, выступаючы на канферэнцыі, заявіў, што ЗША неабходна сфакусіравацца сваю знешнюю палітыку на Азіі. А значыць, трэба перастаць накіроўваць рэсурсы да «сваіх сяброў за Атлантыкай». Аналагічнага меркавання прытрымліваюцца многія аднапартыйцы Вэнса. «Праблема Еўропы ў тым, што яна сама па сабе не забяспечвае дастатковага стрымлівання, пакольні не праяўляе дастатковай ініцыятывы. Амерыканская коўдра прывяла да атрафіі еўрапейскай бяспекі», — сказаў Вэнс.

Пра песімізм на форуме па бяспецы паведаміла і брытанская газета Financial Times. Канферэнцыя ў чарговы раз не змагла выйсці за рамкі чыста дыскусійнай пляцоўкі і не дала адказаў на многія актуальныя пытанні. Ваенны эксперт Ніка Ланге адзначыў, што форум пакінуў ўражанне, быццам «калектыўны Захад практычна не здольны ўвасобіць словы ў дзеянні». «Яшчэ ніколі Захад не быў у такой роспачы, як на канферэнцыі па бяспецы 2024 года», — канстатавала мюнхенская газета Muenchner Merkur.

Пэўную рысу форуму падвялі тысячы маніфестантаў, якія сабраліся ў Мюнхене, калі завяршылася работа міжнароднай канферэнцыі па бяспецы. Удзельнікі акцый заклікалі сусветных лідараў пакласці канец канфліктам па ўсім свеце. Галоўным патрабаваннем пратэстоўцаў стала спыненне паставак зброі ў зоны канфлікту. У прыватнасці, гучалі лозунгі аб недапушчальнасці напампоўвання зброяй Украіны, а таксама працягу ваеннай аперацыі Ізраіля супраць мірных палесцінскіх грамадзян.

Многія раскрытыкавалі саму Мюнхенскую канферэнцыю па бяспецы, якая перастала адпавядаць першапачаткова заяўленым мэтам і больш не спрыяе сусветнай стабільнасці. Маніфестанты неслі плакаты з лозунгамі, якія выкрываюць палітыку краін НАТА па развязванні канфліктаў: «Нам патрэбен дыялог, а не канфрантацыя», «Не гонцы ўзбраенняў», «Супраць Германіі, якая ваюе». Адзін з удзельнікаў акцыі ўказаў, што Вашынгтон спрабуе ўцягнуць Германію ў вялікую вайну: «Нам патрэбен мір з Расіяй, наш сапраўдны вораг знаходзіцца ў ЗША».

**Захар БУРАК.**




### Даслоўна

## «Маскі скінуты»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назваў асаблівасць цяперашняй фазы цывілізацыйнага супрацьстаяння Захад—Усход. Адпаведныя заявы ён зрабіў на пашыранай нарадзе з кіруючым складам дзяржаўных органаў сістэмы гарантавання нацыянальнай бяспекі.

«У бенефіцыяраў вайны няма інтарэсу спыняць бойню чужога для іх народа. Занадта высокія стаўкі, ды і прыбыткі — неймаверныя, — адзначыў Прэзідэнт. — Кошт аднаго натаўскага 155-міліметровага артылерыйскага снарада, напрыклад, вырас з пачатку вайны ва Украіне ў чатыры разы — з дзвюх да васьмі тысяч еўра. Як гаворыцца, без каментарыяў».

Асаблівасць цяперашняй фазы цывілізацыйнага супрацьстаяння Усход—Захад Прэзідэнт ахарактарызаваў так — маскі поўнасцю скінуты. «Калі раней для задавальнення сваіх геапалітычных амбіцый Вашынгтон хоць бы прыдумляў важкую падставу (усе памятаюць прабірку — Ірак), выкарыстоўваў мяккую і разумную, так сказаць, сілу, інспіраваў «каляровыя рэвалюцыі», гібрыдныя і проксі-войны па даверанасці, то сёння пераходзіць да адкрытай агрэсіі і фізічнага знішчэння непажаданых — без якіх-небудзь інфармацыйных прэлюдый», — патлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Па словах беларускага лідара, цяпер нам скідваюць тэзіс аб тым, што шматпалярны свет — гэта свет некантраляванага росту агентаў хаосу, патрэбен адзін глабальны паліцэйскі (так пішуць вядучыя сродкі масавай інфармацыі Захаду). «Хлусня, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Так званы некантраляваны рост спраўкаваў і ўсё яшчэ спрабуе кантраляваць Вашынгтон. Гэта іх агонія. Толькі шматпалярны свет здольны ўсталяваць раўнавагу і гарантаваць бяспеку на ўсіх кантынентах. Пераход да яго вельмі стрэсавы і драматычны. А па-іншаму і не можа быць».

# ПОДЗВІГ БАЙЦОЎ РАГАЧОЎСКА-ЖЛОБІНСКАЙ

**Удары, прарывы, наступленні... Па карце баёў лютага 1944 года на міжрэччы Дняпра і Друці Рагачоўскай зямлі відаць напрамкі, па якіх Чырвоная Армія выбівала з мясцовасці фашыстаў. У тым самым напружаным лютым 1944-га менавіта на гэтым участку савецкія героі захапіць друцкі плацдарм. Гэты ўчастак адваяванай тэрыторыі стане адным з пунктаў, адкуль пачыналася легендарная аперацыя «Баграціён». За стрэлкамі на ваенных картах, бітвах, апісаных у хроніках, — лёсы байцоў, іх камандзіраў, генералаў войскаў. Баявы шлях савецкіх герояў на Рагачоўшчыне вывучаюць, памяць аб іх захоўваюць школьнікі. Рагачоўскі раённы цэнтр турызму і краязнаўства кожны год арганізоўвае патрыятычныя экспедыцыі для навучэнцаў. 24 лютага — пункт адліку мірнага жыцця пасля перажытай нямецкай акупацыі. У экспедыцыю па месцах баявога шляху ўдзельнікаў Рагачоўска-Жлобінскай наступальнай аперацыі прапаноўвае адправіцца праект «Звязды» «Шляхамі вызвалення».**

## Вызвалены тройчы

24 лютага 1944 года Масква салютавала доблесным войскам 1-га Беларускага фронту, якія вызвалілі Рагачоў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Між тым менавіта на Рагачоўскай зямлі за час Вялікай Айчыннай вайны адбылося нямала пераломных момантаў ваеннай гісторыі. Звяртае на гэта ўвагу **краязнаўца, гісторык, педагог дадатковай адукацыі вышэйшай катэгорыі, дырэктар Рагачоўскага раённага цэнтра турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі Генадзь ЦІТОВІЧ.**

У ліпені 1941 года на тэрыторыі Рагачоўшчыны разгарнулася першае савецкае контрнаступленне, якое стрымала рух гітлераўцаў на Маскву. Так, 63-і стралковы корпус Леаніда Пятроўскага выбіў фашыстаў з Рагачова і Жлобіна. Чырвонаармейцы месяц утрымлівалі гарады і вымусілі немцаў змяніць першапачатковыя планы развіцця вайны.

— Летам 1944 года вёска Малыя Канапліцы Рагачоўскага раёна стала адным з апорных пунктаў аперацыі «Баграціён», у выніку якой была поўнасцю вызвалена Беларусь, — падкрэслівае Генадзь Цітовіч. — З канца лістапада 1943 года правае крыло Беларускага фронту сіламі 3-й арміі генерала Аляксандра Гарбатава, 50-й арміі генерала Івана Болдзіна, 63-й арміі генерала Уладзіміра Калпакчы вялі баявыя дзеянні на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага, Кармянскага, Жлобінскага, Слаўгарадскага раёнаў. Гэта дапамагло адцягнуць увагу немцаў ад паўднёвага крыла Беларускага фронту, дзе 65-я армія Паўла Батава і 61-я Паўла Бялова рыхтаваліся да Калінкавіцка-Мазырскай наступальнай аперацыі.

У канцы лістапада 1943-га года 50-я і 3-я армія падышлі да паўднёвай і ўсходняй часткі Рагачоўшчыны. Былі вызвалены Драгунск, Старая Алешня, Курганне. 24—25 лістапада 4-я рота 334-га стралковага палка 120-й стралковай дывізіі пры вызваленні Старой Алешні на працягу сутак адбіла 12 контратак ворага, з 50 байцоў роты ў жывых засталіся толькі чатыры салдаты. Злучэнне панесла найбуйнейшыя страты ў баях на тэрыторыі Гарадзецкага сельсавета. На паўночным захадзе ад вёскі Буда ў кровапралітных баях дывізія страціла звыш трох тысяч салдат і афіцэраў. Мала хто ведае, але менавіта на Рагачоўшчыне тады закладваліся баявыя традыцыі рускага ваенна-марскога флоту. Байцы 120-й стралковай дывізіі ў 1945 годзе былі адабраны ў марскую пяхоту Паўночнага флоту Савецкага Саюза, а пазней Расійскай Федэрацыі.

Між тым 27 лістапада 1943-га 269-я стралковая дывізія 3-й арміі працягвала вызваленне Рагачоўшчыны. Падчас баёў за вёску Журавічы на працягу сутак населены пункт пераходзіў з рук у рукі ад савецкіх байцоў да фашыстаў тры разы. У той жа дзень вызвалілі Хатаўню, пазней — Званец, Ільіч, Стары Крыўск і Доўск. 169-я дывізія выбіла акупантаў з усходняй часткі Гадзілавічаў. Вёскі Стоўпня, Гарадзец вызваляла 250-я стралковая дывізія. З сярэдзіны снежня 1943 года да пачатку студзеня 1944-га фронт на гэтым участку стабілізаваўся па лініі населеных пунктаў Званец — Шапчыцы — Свержань — Гадзілавічы — Гарадзец.

## Рагачоўска-Жлобінскі рывок

— У канцы студзеня і ў пачатку лютага 1944 года камандуючы 3-й арміяй Аляксандр Гарбатаў праявіў ляе ініцыятыву. Звярнуўся да камандуючага Беларускім фронтам Канстанціна Ракасоўскага з прапановай узмацніць яго 3-ю армію за кошт 63-й арміі генерала Уладзіміра Калпакчы і, захапіўшы плацдарм на правым беразе Дняпра, вызваліць Рагачоў, — расказвае гісторык Генадзь Цітовіч. — У пачатку лютага генерал Аляксандр Гарбатаў звярнуўся да камандуючага Беларускім фронтам з такой жа прапановай ізноў. Гэты раз паспяхова. Канстанцін Ракасоўскі ўзгадніў са Стаўкай Вярхоўнага галоўнакамандуючага правядзенне Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі. Была пастаўлена задача 21 лютага фарсіраваць Дняпро ў раёне вёсак Віляхоўка і Кісцяні, 22-га вызваліць Рагачоў з вёскамі Фалевічы, Азяраны, Ціхінічы, а 23 лютага вызваліць Жлобін і наступаць у бок Бабруйска.

Пачалася падрыхтоўка да аперацыі: адпрацавалі планы баявых дзеянняў з камандзірамі стралковых карпусоў і дывізій, прыстралялі гарматы, тылавыя службы падвезлі неабходныя боепрыпасы да артылерыйскіх падраздзяленняў. У ноч з 19 на 20 лютага інжынерныя часці 3-й арміі на некалькіх участках паклалі насціль для мастоў. У ноч з 20 на 21 лютага 8-ы асобны штрафны батальён пад камандаваннем ураджэнца Рагачоўскага раёна Аркадзя Осіпава фарсіраваў Дняпро ў раёне Гадзілавічаў, здзейсніў рэйд у варожы тыл.

Гэта быў пачатак Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі — другога этапу вызвалення Рагачоўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Раніцай 21 лютага войскі 3-й арміі перайшлі ў наступленне. Пасля артылерыйскага налёту 22 лютага стралковыя дывізіі пераадолелі моцны агнявы націск і рушылі ў напрамку да вёскі Мадора. Аднак танкі, артылерыя не паспявалі за рухам пяхоты. У баях за гэты населены пункт 120-я стралковая дывізія панесла вялікія страты: загінулі звыш 600 байцоў і камандзіраў.

22 лютага, прарваўшы абарону праціўніка на фронце да 50 кіламетраў, чырвонаармейцы рушылі наперад і вызвалілі населеныя пункты Нова-Быхаў, Лазаравічы, Віляхоўка, Верхняя і Ніжняя Ташчыца, Кісцяні, Вішчын. 23 лютага ў рашучым наступленні вызвалілі два важныя ў тактычных адносінах населеныя пункты — Шчыбрын і Мадору. Вызвалілі таксама населеныя пункты Яленава, Сялец, Вялікія і Малыя Канапліцы. На трэці дзень наступлення войскі 120-й стралковай дывізіі занялі паўночную частку Рагачова. Раніцай 24 лютага ў паўднёвую частку Рагачова ўвайшлі палкі 169-й стралковай дывізіі. Немцы правялі тры контратакі па савецкіх вайсковых у горадзе і тры авіяцыйныя налёты па 20—30 самалётаў, але наша пяхота стаяла да смерці. Горад утрымалі. Але заходнюю частку Рагачова — Задруцце — вызвалілі ўжо на трэцім этапе, падчас Бабруйскай аперацыі Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён».

24 лютага 120-я стралковая дывізія на поўнач ад Рагачова адным батальёнам правяла разведку боем, фарсіравала Друць каля вёскі Каласы. Але нашых байцоў цалкам знішчылі. 250-я стралковая дывізія адным батальёнам правяла разведку боем і ўварвалася ў вёску Азяраны, але на працягу 45 мінут батальён быў знішчаны ворагам. Больш паспяхова фарсіравалі Друць байцы 269-, 169-, 323-, 129-й стралковых дывізій, а таксама воіны 8-га асобнага штрафнога батальёна.

— Цікавы гістарычны факт з біяграфіі савецкіх палкаводцаў, — звяртае ўвагу гісторык Генадзь Цітовіч. — У гэтыя дні 25—26 лютага разгарэлася спрэчка двух военачальнікаў Канстанціна Ракасоўскага і Аляксандра Гарбатава. Стала пытанне — выконваць патрабаванні Стаўкі Галоўнакамандуючага па далейшым наступленні, як планавалася, ці не выконваць? На гэтым участку ў разлютаваных баях войскі неслі былі вялікія страты. Камандуючы 3-й арміяй Аляксандр Гарбатаў пераконвае, што далей нельга працягваць наступленне. Ён кажа, што проста знішчыць сваё ўзбуйненае войска, калі будзе далей наступаць. Там вышыні, высокі бераг Друці, усё прастрэльваецца ворагам, а немцы гатовы знішчаць. Аб дыскусіі двух палкаводцаў даведалася Стаўка і асабіста Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Вышэйшае ваеннае кіраўніцтва падтрымала пункт гледжання камандуючага 3-й арміяй Аляксандра Гарбатага: перайсці да абароны, захаваўшы войска.



Краязнаўца, гісторык, педагог дадатковай адукацыі вышэйшай катэгорыі, дырэктар Рагачоўскага раённага цэнтра турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі Генадзь ЦІТОВІЧ.

## Друцкі плацдарм

Між тым 25 лютага савецкім байцам удалося фарсіраваць Друць і захапіць плацдарм на правым беразе ракі. Гэта была тэрыторыя ад вёскі Касцяшова да вёскі Вялікія Канапліцы. Участак прарыву — восем кіламетраў — уразаўся акурат у лінію нямецкай абароны на паўтара-тры кіламетры. На Друцкім плацдарме жорсткія баі з ворагам ішлі бесперапынна з лютага і да сярэдзіны сакавіка.

Ва ўспамінах камандуючы 3-й арміяй Аляксандр Гарбатаў аб баях на гэтым участку пісаў: «Нашы асцярогі за плацдарм на рацэ Друць цалкам апраўдаліся.



Герой Савецкага Саюза, удзельнік вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, генерал арміі Аляксандр Гарбатаў.

Ужо 1 сакавіка 1944 года пасля магутнай артпадрыхтоўкі сапернік распачаў тры атакі днём, дзве ноччу. Усе яны былі адбіты з вялікімі для немцаў стратамі. Паміж населенымі пунктамі Азяраны і Вірычаў праціўнік у двух месцах урываўся ў нашу першую траншэю, але ў рукапашнай схватцы быў адбіты, пакінуўшы ў траншэі 83 чалавекі забітымі і параненымі. На працягу 2 сакавіка сапернік бесперапынна абстрэльваў плацдарм магутным артагнём і наносіў удары сарака «Юнкерсамі».

Дэталёва пра падзеі тых дзён напісаў удзельнік вызвалення Рагачоўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Філіп Пятровіч Гожаў. У лютым — жніўні 1944 года ён быў камандзірам батальёна, які замацаваўся на Друцкім плацдарме:

«Вельмі цяжка было, калі вораг ужываў авіяцыю. Нямецкія штурмавікі «Юнкерс-87» савецкія салдаты называлі «лапатнікамі». Падкрылкі шасі гэтых самалётаў нагадвалі лапці. У пачатку сакавіка 1944 г. нямецкія самалёты ляцелі на пазіцыю звёнамі, а над савецкімі пазіцыямі ўтварылі круг. Нашы салдаты назвалі такое размяшчэнне самалётаў «Чортава кола». Бамбёжка пазіцый 1-га батальёна пачалася з уключэння сірэны. Ад такога выцця, грукату, выбухаў псіхіцы салдата цяжка справіцца са страхам. Самалёты рухаюцца па крузе, пакуль не адбамбяцца, затым на брыючым палёце «паліваюць» пазіцыі агнём авіяцыйных кулямётаў».

З сярэдзіны сакавіка і да сярэдзіны чэрвеня насупраць Друцкага плацдарма немцы пачалі ўзводзіць эшаланіраваную абарону. Выкарыстоўвалі свае інжынерныя часткі і вязняў працоўных лагераў. У гэты ж час савецкія войскі падцягвалі рэзервы, праводзілі навучанне маладога папаўнення воінскіх часцей — ішла падрыхтоўка Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён».

## «Штрафбаця»

Нельга не расказаць асобна пра савецкіх герояў, якія 26 лютага прынялі ўдзел у захопе плацдарма на правым беразе ракі Друць. Гэта байцы 8-га асобнага штрафнога батальёна. Камандаваў ім ураджэнец Ціхініч Рагачоўскага раёна — Аркадзь Аляксандравіч Осіпаў. У ноч з 20 на 21 лютага ў раёне вёскі Гадзілавічы байцы 8-га асобнага штрафнога батальёна ва ўзаемадзеянні з лыжным батальёнам незаўважна для немцаў перайшлі лінію фронту. Стаяла задача

# НАСТУПАЛЬНАЙ АПЕРАЦЫІ

зайсці ў тыл ворага, прабрацца да заходняй ускраіны Рагачова, захапіць горад і ўтрымліваць яго да падыходу асноўных сіл арміі. У выпадку няўдачы або адмены гэтага задання байцам 8-га асобнага штрафнога батальёна даручылі ў тыле ворага актыўна парушаць камунікацыі, сувязь, узрываць масты, па якіх могуць праходзіць гітлераўскія войскі, граміць штабы. Такім чынам сапраўды ўдалося пасеяць паніку і адцягнуць увагу нямецкага камандавання ад перадавой лініі фронту, дзе пачыналася паспяховае наступленне савецкіх войскаў і вызваленне Рагачова.

«Дагэтуль я не перастаю дзівіцца, як нашаму камбату атрымалася амаль увесь велізарны па тым часе батальён правесці так па-майстэрску, хоць і па добра яму знаёмай, але занятай ворагам мясцовасці. Армейскім сапёрам, якія забяспечвалі наш пераход, камбат дакладна паказаў месца, дзе яны нажніцамі непрыкметна для немцаў выразалі звяно калючага дроту... І гэтае месца недалёка ад вёскі Кісцяні аказалася гэтак удала абраным!» — так напіша ў сваёй кнізе аб 8-м штрафным батальёне і іх камбаце Аркадзе Осіпаве (якога байцы з любоўю называлі «бацяй») камандзір узвода лейтэнант Аляксандр Пыльцын.

Аляксандр Васільевіч — чалавек дзіўнага лёсу, герой Вялікай Айчыннай вайны, гісторык, пісьменнік, член Акадэміі ваенна-гістарычных навук, ганаровы грамадзянін Рагачоўскага раёна, генерал-маёр Узброеных Сіл СССР. У складзе 8-га асобнага штрафнога батальёна Аляксандр Пыльцын удзельнічаў у баях пад Жлобінам у снежні 1943 года і ў знакамітым пяцісутачным рэйдзе ў тыл ворага на Рагачоўшчыне, а таксама ў баях за вызваленне Рагачова 23—24 лютага 1944 года, у баях пры фарсіраванні ракі Друць. У сваіх успамінах франтавік дэталёва апісаў падзеі, якія перажыў ён і яго баявыя таварышы пры ўзяцці Друцкага плацдарма.

«...Далі заданне захапіць у немцаў плацдарм на рацэ Друць. Для гэтага трэба было ўначы незаўважна пераадолець па лёдзе гэтую раку, без артпадрыхтоўкі і крыкаў «ура!», зусім раптоўна атакаваць праціўніка... выбіць немцаў з першай траншэі і, развіваючы наступленне, забяспечыць увод у бой іншых вайсковых часцей з захопленага плацдарма. На рацэ Друць, як адзначаў генерал Гарбатаў, асабліва моцнай была першая паласа абароны немцаў глыбінёй 6-7 км з трыма пазіцыямі... Шырыня ракі — да 60 метраў, глыбіня — 3,5 метра. Забалочаная, слабапрамерзлая даліна да паўтара кіламетра... У адрозненне ад дняпроўскага лёду, на гэтай рацэ лёд быў ладна пабіты і даводзілася намацваць яго нагамі, каб не трапіць у палонкі, утвораныя выбухамі снарадаў і мін. Як на злосць, мне давялося менавіта тут прыняць ледзяную купель... Тым часам на беразе пачалася перастрэлка, якая ўсё больш узмацнялася... Як адзначаў генерал Гарбатаў, нямецкая абарона на рацэ Друць была магутнай. Былі там і доты з металічнымі каўпакамі, і шчыльныя мінныя палі, і дрот у тры колы. Але на нашым участку міннага поля не аказалася, а драцяныя загароды былі слабымі. І гэта яшчэ адно сведчанне таго, што камандарм у любой сітуацыі імкнуўся пазбегнуць неапраўданых страт. Ды і разведка ў яго добра папрацавала, выявіўшы найменш умацаваны ўчастак нямецкай абароны».

Аляксандр Пыльцын у сваіх успамінах звяртаў увагу, што камандуючы 3-й арміяй генерал Гарбатаў паабяцаў і выканаў: «за ўзорнае выкананне пастаўленай задачы ўсе штрафнікі, якія праявілі сябе ўстойлівымі байцамі, незалежна ад таго, ці будуць яны параненыя, «ці пральюць кроў», вызваляюцца ад далейшага знаходжання ў штрафным батальёне, аднаўляюцца ў ранейшых званнях, а тых, хто асабліва вызначыцца, будуць узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

## Прыклады мужнасці

Між тым узораў мужнасці і гераізму воінаў у ходзе Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі было вельмі шмат. Адзін з іх — камандзір стралковай роты 1092-га стралковага палка 269-й стралковай дывізіі старшы лейтэнант Іван Іванавіч Хмель. Пасля пераадолення Дняпра ён незаўважна вывеў роту да пазіцый ворага і ў момант артпадрыхтоўкі павёў у атаку. У выніку бою рота забяспечыла пераправу артылерыі па лёдзе. Мужны афіцэр загінуў, пасмяротна быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». На іншым участку прарыву гэтага ж палка лейтэнант Міхаіл Рыгоравіч Маладзікоў, пераадолеўшы два мінныя палі і драцяныя загароды, пад моцным агнём праціўніка авалодаў плацдармам, знішчыў гарнізон вузла ворага, кулямётны пункт, адбіў некалькі контратак праціўніка, узяў у палон пяцярых гітлераўцаў. Ён таксама быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

У баях на Рагачоўшчыне праявіў выключную мужнасць, бясстрашнасць і гераізм будучы Герой Савецкага Саюза, камандзір роты аўтаматчыкаў 556-га стралковага палка 169-й стралковай дывізіі 3-й арміі 1-га Беларускага фронту Гулям Якубаў. У баях на захадзе ад Гадзілавічаў яго рота аўтаматчыкаў захапіла варожы плацдарм. Немцы спрабавалі адбіць тэрыторыю з дапамогай танкаў, але нічога ў іх не атрымалася. За мужнасць у баі Гулям Якубаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. У баях каля вёскі Турск рота аўтаматчыкаў Гуляма Якубава 8 лютага пры штурме нямецкіх пазіцый вышыні 145.1 была накіравана ў тыл да немцаў. «Якубаўцы» знішчылі тры нямецкія батальённыя пункты кіравання, шэраг гарматных і мінамётных разлікаў, парушылі тэлефонную сувязь, затым сабраліся ва ўмоўным месцы для ўдару з тылу па ворагу. Немцы акружылі байцоў, але савецкія аўтаматчыкі адбілі некалькі нападаў ворага, забілі звыш 200 гітлераўцаў. У баях за лепшую вышыню ў Быхаўскім раёне рота аўтаматчыкаў Гуляма Якубава знішчыла больш за чатыры сотні варожых салдат. Загінуў там і сам герой.



Капліца-мемарыял памяці воінаў 120-й гвардзейскай стралковай дывізіі ўзведзена на месцы разлютаваных баёў 1944 года ў вёсцы Мадора Рагачоўскага раёна.



Беларускі фронт. Гвардзейцы ідуць у наступленне пад прыкрыццём дымавой заслоны ў раёне г. Рагачова (фота з фонду Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны).



Захопленыя войскамі Чырвонай Арміі падчас Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі нямецкія гарматы (фота з фонду Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны).




Карта наступлення Чырвонай Арміі падчас Рагачоўска-Жлобінскай наступальнай аперацыі ў лютым 1944 года.

## Новая старонка ў жыцці горада

Трэці этап вызвалення Рагачоўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачаўся ўжо падчас Бабруйскай наступальнай аперацыі ў рамках аперацыі 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем легендарнага палкаводца Канстанціна Ракасоўскага — «Баграціён».

З Рагачоўшчыны на бабруйскім напрамку былі сканцэнтраваны 3-я армія Аляксандра Гарбатава, 48-я армія Пракофія Раманенкі і частка авіязлучэнняў 16-й паветранай арміі генерала Сяргея Рудэнкі. Напярэдадні аперацыі, 20 чэрвеня, прадстаўнік Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага Георгій Жукаў пабываў не толькі ў штабе 3-й арміі, але і на пярэднім краі абароны. Аб складанасці і маштабах пастаўленых перад камандуючымі арміямі задач сведчыць той факт, што 3-я армія была ўкамплектавана пяццю стралковымі карпусамі. Сухапутным вайсковым злучэнням аказвалі дапамогу бамбардзіровачныя, знішчальныя авіякарпусы, асобныя авіядывізіі 16-й паветранай арміі. Стралковым дывізіям дапамагала артылерыя. На адным квадратным кіламетры было сканцэнтравана больш за 200 артылерыйскіх ствалоў. Бабруйская аперацыя на тэрыторыі Рагачоўскага раёна пачалася ў ноч з 23 на 24 чэрвеня 1944 года.

## Памяць жыве

Гісторык, краязнаўца, дырэктар Рагачоўскага раённага цэнтра турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі Генадзь Цітовіч нагадвае, што 13 воінскім часцям і злучэнням за вызваленне Рагачова ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў было прысвоена ганаровае найменне «Рагачоўскія».

— Сямнаццаці ўраджэнцам Рагачоўшчыны прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, двум — званне поўнага кавалера ордэна Славы. Усяго Героямі Савецкага Саюза і поўнымі кавалерамі ордэна Славы сталі 59 чалавек, якія праявілі мужнасць і гераізм у баях пад Рагачовам, — падкрэслівае Генадзь Цітовіч. — У баях за вызваленне Рагачоўшчыны загінулі звыш 16 тысяч салдат і афіцэраў. На тэрыторыі Рагачова і раёна знаходзіцца больш 80 воінскіх пахаванняў, у якіх вечны спачын знайшлі амаль 19 тысяч воінаў Савецкай арміі.

Самыя буйныя брацкія пахаванні на Рагачоўшчыне знаходзяцца на тэрыторыі Гарадзецкага сельсавета, каля вёскі Буда. Тут пахавана звыш трох тысяч вайскоўцаў 250-й стралковай дывізіі. Каля дзвюх тысяч байцоў пахаваны ў брацкім пахаванні ў вёсцы Старое Сяло, звыш тысячы савецкіх герояў вечны спачын знайшлі ў вёсцы Азараны.

Сёння адметнасць Рагачоўскага раёна — валанцёрскія турыстычна-краязнаўчыя экспедыцыі па месцах аперацыі «Баграціён».

— У 1998 годзе адбыўся першы такі паход. Ідэю падобных экспедыцый у свой час агучыў рагачоўскі краязнаўца Міхаіл Прохаравіч Макараў, які вывучаў баявы шлях 16-й паветранай арміі пад камандаваннем маршала авіяцыі Сяргея Рудэнкі, — згадвае Цітовіч.

Генадзь Васільевіч сам ужо больш чым дваццаць гадоў штогод праводзіць валанцёрскія турыстычна-краязнаўчыя экспедыцыі ў розных частках Рагачоўскага раёна.

— Правялі ўжо больш за сорак экспедыцый рознай накіраванасці, — дадае гісторык. — Разам са школьнікамі, навучэнцамі цэнтра турызму і краязнаўства добраўпарадкоўваем брацкія пахаванні савецкіх воінаў, збіраем матэрыялы аб фактах генацыду беларускага народа падчас фашысцкай акупацыі, занатоўваем успаміны сведак падзей Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі лёсу воінаў-інтэрнацыяналістаў — ураджэнцаў Рагачоўшчыны. У цэлым вядзецца комплексная гісторыка-краязнаўчая работа з нашай моладдзю.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**государственного предприятия «Управление капитального строительства Запад» по жилому дому № 3 (по генплану) в составе объекта «Многоквартирные жилые дома со встроенными помещениями торгово-административного назначения и подземными гаражами-стоянками в границах пр. Дзержинского, ул. Щорса (№ 3, № 4 по генплану)»,** *опубликованной в газете «Звязда» 14.10.2023*

**Застройщик:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 05.01.2015 за №192400611.

**Юридический адрес и местонахождение предприятия:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 4-107, тел./факс (017) 234-16-99.

**Офис продаж:** 220025, г. Минск, ул. С. Есенина, 6, офис 213, тел.: (017) 234 16 98, (044) 795 44 44, (044) 559 33 91.

***Режим работы офиса продаж:*** понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

